Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне
“Таварыства беларускай школы”
Грамадскае аб’яднане “Цэнтар Супольнасьць”

# *Матэматычны*

# ф а л ь к л о р

*Пачатковыя матэматычныя ўяўленні і навыкі
сродкамі народнай педагогікі*

*Аўтар-складальнік*

***Алесь ЛОЗКА***

Менск 2002



***Алесь ЛОЗКА***

***Фалькларыст, педагог.***
***Аўтар-складальнік дапаможнікаў***
***для выхавальнікаў, настаўнікаў і педагогаў***
***усіх відаў асветных устаноў ад дашкольных да ВНУ:***
***«Ехала Каляда ў чырвоным вазочку…». Мн., 1990 (у сааўт.);***
***«Беларусазнаўства. I-XI кл. » у 4-ох кн.(кіраўнік творчага калектыву).***
***Мн., 1992-1994; «Беларусазнаўства: Навучальны дапаможнік БДУ » / Навук. рэд.***
***П. Брыгадзін. Мн., 1997; 1998 (у сааўт.); «Гульні, забавы, ігрышчы», том серыі БНТ. Мн.,***
***1996; «Беларускі скаўтынг», «Беларуская батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні».***
***Мн., 1997; «Тэатр лялек». Мн., 1997 (у сааўт); «Восеньскія святы». Мн., 1995;***
***«Зімовыя святы». Мн., 1999; «Веснавыя святы». Мн.,2000; «Летнія***
***святы». Мн., 2001 (у сааўт.). Аўтар манаграфій «Беларускі***
***народны каляндар». Мн, 1993, 2002; «Беларускі***
***каляндар у славянскім і еўрапейскім***
***свеце». Мн., 2002 і іншых***
***артыкулаў (больш***
***150).***

# ***П р а д м о в а***

***Матэматычны фальклор ці фальклорная матэматыка? І першае, і другое – новатворы, неалагізмы. На нашу думку, матэматычны фальклор бліжэй да фалькларыстыкі, а другое – да педагогікі, этнапедагогікі. І ў той жа час два паняцці вельмі блізкія і звязаны паміж сабой.***

***У існуючых працах па беларускай народнай педагогіцы* гаворыцца пра выхаванне. У сваім дапаможніку мы ўпершыню прадстаўляем матэрыял не толькі для выхаваўчых мэтаў, але і вучэбнай дзейнасці, і ў прыватнасці, для заняткаў па развіцці інтарэса ў дзяцей да матэматыкі, далучэння да яе асноў, фарміравання элементарных матэматычных уяўленняў, развіцця вобразнага і лагічнага мыслення. І ў дапамогу педагогу прапануюцца блізкія і натуральныя ў дзіцячым асяроддзі традыцыйныя сродкі народнай педагогікі, праверааныя дзесяцігоддзямі: лічылкі, калыханкі, дражнілкі, песенькі, жарты, казкі, прыказкі, прымаўкі, прыкметы, фраземы, загадкі, загадкі-задачы, гульні, святы…і нават замовы.***

***Як лепшыя здабыткі вуснай народнай творчасці, яны годна паслужаць справе вобразнага мыслення. Здатнейшага настаўніка, чым лічылкі і гульні-забавы ў развіцці колькасных уяўленняў, паспрабуйце знайсці. А мудрэй самых прыказак, загадак, загадак-задач у набыцці пачаткаў лагічнага мыслення, бадай, не бывае. Казка любога зачаруе, прывабіць, песня і гульня развесяляць і ў той жа час нязмушана дадуць патрэбную суму навыкаў і ведаў. Тое ж самае можна сказаць і пра іншыя задачы (у галінах ведаў пра велічыню, геаметрычныя фігуры і форму прадметаў, арыенціроўцы ў прасторы і часе), якія вынікаюць у прыватнасці з дзеючых праграм дашкольнага навучання і выхавання**. Існуючыя дапаможнікі па навучанні пачаткаў матэматыкі***, напісаныя не на роднай мове, нават з добрым перакладам і ў якіх спадарожна згадваюцца некаторыя беларускія фальклорныя прыклады, нас ужо не павінны задавальняць, калі ў краіне развіваецца сетка "этнасадоў" і "этнашкол" – зародкаў нацыянальнай асветы.***

***У сваіх спробах мы не імкнёмся стварыць новы спецыяльны дапаможнік для дашкольнікаў. Для гэтага патрабуецца творчая эксперыментальная праца, уключэнне ў вучэбны працэс іншых элементаў, напрыклад, літаратурных твораў і г.д. Нямала карыснага ў ім знойдуць і настаўнікі пачатковых класаў, і выхавальнікі больш старэйшых узроставых груп. Гэта – матэматычны фальклор, прадстаўлены фальклорна-этнаграфічнымі адзінкамі ў паслядоўна-ўзрастаючай лікавай градацыі. Толькі для асобных твораў падабраны заданні, зроблены асцярожныя касметычныя праўкі, асабліва ў замене дыялектызмаў. Творы прадстаўлены так і ў той класіфікацыі, як і ў якой яны пададзены пэўнымі складальнікамі. Напрыклад, у раздзеле "Фраземы"(фразеалагізмы), акрамя сінанімічных і блізказначных моўных адзінак пазначаны і рускія адпаведнікі. Педагог выбірае сабе тое, што патрэбна на пэўны занятак.***

***Выданне ўяўляе сабою скарочаны пачатковы варыянт, праца над якім працягваецца і, будзем спадзявацца, выйдзе асобнай кнігай. Аўтар-складальнік з прыемнасцю прыме Вашы заўвагі і прапановы.***

---

****Гл. літаратуру ў канцы выдання.***
*****Пралеска. Мн., 2000. С.301-303.***
****** Гуляем, навучаем, развіваем, ці Знаёмім дзяцей з матэматыкай. Мн., 1997.***

# Лікі 1 і 2

***Прыказкі і прымаўкі***

Адзін у полі не воін.
Адным пальцам вузла не завяжаш.
Адным пальцам і гузік цяжка зашпіліць.
Адзін дуб у полі – не лес.
Адным колам плата не падапрэш.
Адзін дасуж, да не дуж.
Адно вока бачыць далёка, а два яшчэ далей.
Адным сэрцам свету не запаліш.
Аднаму льецца, а другому нават не капае.
Адна бяда ідзе, другую за ручку вядзе.
Адна бяда не ходзіць, другую за сабою водзіць.
Аднаму аж з горла прэ, а другі з голаду мрэ.
Адна галавешка не гарыць, а толькі тлее.
Аднаму і ў кашы няспорна.
Аднымі рукамі нямнога зробіш.
Адзін з агнём, другі з вадою.
Адзін з агнём, другі з полымем.
Адным арэхам падзеляцца.
Адно зерне пуды прыносіць.
За аднаго бітага, двух нябітых даюць.
Адным разам дрэва не зваліш.
Адзін, ды ладны.
Адзін, ды нелюдзін.
Адна галава не бяда, а калі і бяда, то адна.
Адной маткі не адны дзеткі.
Адною крупінкаю сыты.
Аднаму капейка і тая рабром.
Аднаму і шыла і трэска голіць, а другому і брытва не хоча.
Адзін другога даводзіць да ліхога.
Адзін к лесу, другі к бесу.
Адно маўчыць, а другое слухае.
Адною рукою дае, а дзвюма адбірае.
Адным кірмаш, а другім жыцця нямаш.
Дзве работы зараз не зробіш.
Дзень дню розніца: адзін матка, а другі – мачыха.
Другі жупан не варты світкі.
Вясною вядро вады, а лыжка балота, а ўвосень лыжка вады, а вядро балота
З аднаго вала дзвюх скур не дзяруць.
Загані грош, да будуць рублі.
І дзве капейкі грошы.
Кабыла лыса, жарабя рабое – паеў воўк абое.
Капейка рубель беражэ.
Купіў бы сяло, ды грошай мало, купіў бы другое, ды не заплочана яшчэ і тое.
На адзін год многа прыгод.
На дзвюх калясках адзін не праедзеш.
Надвое бабка варажыла, а ў адно месца палажыла.

Надвое бабка варажыла: ці памрэ, ці будзе жыва.
Не адзін Гаўрыла ў Полацку.
Не адзін сабака Лыска.
Не адно ліха, дык другое.
Не жаніўся – дзве сарочкі, ажаніўся – дзве сарочкі.
Носіцца як курыца з першым яйкам.
Першую работу заплот выкідаюць.
Першы блін сабаку.
Першы плод за плот.
Першы шпак вясны не робіць.
Раз густа, а другі – пуста.
Рубель без капейкі не бывае.
Рубель рубля робіць.
Скупы двойчы плоціць, а дурны двойчы ходзіць.
Сцеражы бацькаву капейку, то і свае здабудзеш.
Хоць вох, ды ўдвох.
У дурня рот не зачыняецца, а ў другога няўдальца не расчыняецца.
Ягадка да ягадкі і – поўны збан.
Як клёцкі ў малаку, то па дзве валаку, а як у водзе, то раз, два – і годзе.

### *Устойлівыя параўнанні*

Адзін, як вока ў лобе.
Адзін, як колік у плоце.
Адзін, як месячык у небе.

### *Фраземы*

Адзін душою = Адзін аднюткі (адзін-аднюсенькі) = Адзін адзінюткі (адзін адзінюсенькі) = Адзін адненькі = адзін-адным = Усяе талакі – свае дзве рукі – Один одинешенек.

Адна трасца = Адна халера = Адно шчасце = Адзін дабрыдзень = Ці пражаны, ці смажаны – усё адно – Один черт.

Адна хеўра = З адной хеўры – Одна лавочка.

Адзін чорт маляваў = адным грэбенем прычасаліся = Чэрці адной шэрсці – Одним миром мазаны.

За адным скрыпам = За адным цягам = За адным свістам = За адным добрым днём = Адным скокам – Одним махом.

З аднаго гнязда птушкі = З аднаго балота чэрці – Одного поля ягоды.

У адзін дух = Як слова сказаць – Одним духом.

### *Прыкметы*

Два Юр'я ды абодва дурні: адзін галодны, а другі халодны.

Два на гаду Юр'і, два дурні: увосень халодны, а ўвясну галодны.

Калі да Пакроў не было снегу, не будзе яго яшчэ два тыдні.

Калі цёпла да Юр'я, то павінна сена быць і да другога Юр'я і ў дурня.

Прыйшоў Пятрок – апаў лісток, прыйшоў Ілля – апалі два, прыйшоў Барыс – асыпаўся ўвесь ліст.

Прыйшоў Пятрок – апаў лісток, прыйшоў Ілля – апалі два, прыйшоў Барыс – усё пагрыз, прыйшоў Міхал – усіх з поля паспіхаў.

Прыйшоў Пятрок – апаў лісток, прыйшоў Ілля – апалі два, а прыйшла Прачыстая – зусім ачысціла.

Прыйшоў Пятрок – апаў лісток, прыйшоў Ілля – апалі два, прыйшлі святкі – апалі ўсе лісткі.

Прыйшоў Трэці Спас – бяры рукавіцы ў запас.

## *Загадкі*

Адзін гаворыць, двое глядзяць, двое слухаюць. (Язык, вочы, вушы).

Адзін дзед ніколі не наесца. (Млын).

Адзін ляціць. Другі крычыць. Адзін да аднаго прыбліжаюцца, адзін у аднаго пытаюцца. (Вароны).

Адкіну адное, адкіну другое, выму жывое. (Распрэгчы каня).

Адкіну палена, адкіну другое – выведу жывое. (Распрэгчы каня).

Бягуць два панічыкі, задраўшы лычыкі, і масла ядуць. (Сані).

Два арлы арлуюць, чужое яечка балуюць. (Кум, кума і дзіця).

Два браты жывуць цераз дарогу, адзін аднаго не бачаць. (Вочы).

Два браты ў ваду глядзяцца, а разам не сходзяцца. (Берагі).

Два канца, два кальца, а пасярэдзіне цвік. (Нажніцы).

Два стаяць у адной шапцы, адзін ляжыць між ног, адны ходзяць. Адзін водзіць,бо выйсцы б не мог. (Вушакі, парог, дзверы і чалавек).

Два браткі ля аднае хаткі. (Вочы каля носа).

Два брацікі ўперадзе, два брацікі ззаду, адзін аднаго даганяюць. (Колы ў возе).

Два вепрукі рэжуцца, сярод іх пена цячэ. (Жорны і мука).

Дзве панначкі праз маленькі тынец не пералезуць. (Вочы).

Два разы радзіўся, ні разу не ксціўся, а людзі верaць. (Певень).

Загадаю загадку, закіну за градку, у адзін год пушчу, у другі выпушчу. (Азімае жыта).

Між двух свяціл я пасярэдзіне адзін. (Нос).

На хадулях дзве махалкі, над махалкамі зявалка, над зявалкай два калодзежы, над калодзежамі дзве мігалкі, над мігалкамі гай, за гаем чыстае поле, за полем лес. (Чалавек).

Пад дубам райскім, пад крыжом царскім два арлы арлуюць, адно яйцо балуюць. (Хрышчэнне дзіцяці).

Патыліцца слініцца, спераду патрэбная. А ўжываецца толькі адзін раз. (Паштовая марка).

Першы канец у жываце. А другі на верхнім кальцы, каб першы канец дастаць, трэба ўсе кольцы зняць. (Клубок нітак).

Поўны хлеў авец, і адзін баран бляець. (Язык за зубамі).

Поўны хлявец белых авец, адзі баран – і той бляець. (Зубы і язык).

Стаіць два стаўбца, на стаўбцах – дзежка, а ў дзежцы – гладышка, а на гладышцы – гаршчок, а на гаршку – лес, а ў лесе тавар ходзіць. (Чалавек).

У адной дзежцы два хлебцы. (Яйцо).

У беленькай бочцы два розныя півы. (Яйцо).

У зямлю кідаем, не жалеем, на другі гож – разбагацеем. (пасеў).

Ходзіць пан па горадзе, носіць бліны на барадзе, кусок мяса на галаве. (Певень).

Што такое перад намі: дзве аглоблі за вушамі, на вачах па калясу і сядзёлка на насу. (Акуляры).

### *Загадкі-задачы*

Які прадукт харчавання можна зварыць з соллю адзін фунт на адзін фунт, каб можна было есці? (Яйкі). Капаткевіцкі р.

### *Калыханкі*

### А-а, а-а, каткі два…




А-а, а-а, каткі два,
Шэры, белы — абадва
Адзін, лысы, ловіць мышы,
Друг, буры, ловіць шчуры.

Адзін пайшоў па капусце,
Носіць Свеце сон у хусце.
Апсік, каток, на кірмаш,
А Светачка спацькі ляж.

(Дзіцячы фальклор. С. 71. Зап. Л. М. Салавей у 1971 г. у в. Груздава Пастаўскага раёна Віцебскай вобл. ад М.М.Казлоўскай).

***

### Апсік, апсік…

Апсік, апсік,
Каткі два,
Шэранькія абадва.

Адзін каток шэры
І хвасточак белы,
Другі каток шэры
І хвасточак белы.

(Зап. там жа ад К.М.Крывенька).

### *Забаўлянкі*

### Кую, кую ножку…



Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку,
Зарэжу барана,
Паеду да пана.

Пан дасць піражка
І табачкі з ражка.
Кую, кую другую,
Я паеду ў Друю,
Куплю мудрую.

(Дзіцячы фальклор. С. 210 Зап. Г. А. Барташэвіч у 1971 г. у в. Закор'е Браслаўскага раёна Віцебскай вобл. ад Ф. І. Газюкоўскай)

***

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.
Паеду да пана,

Зарэжу барана.
Паеду да Бога,
Зарэжу другога.

(Дзіцячы фальклор. Зап. да 1893 г. у гміне Вішнеўскай Віленскай губерні).

***

Кую, кую ножку,
Паеду ў дарожку.
У госці к цесцю

Пірагоў есці.
Кую, кую другую,
Паеду ў даўгую.

(Дзіцячы фальклор. Зап.да 1874 г. у в.Старое Сяло Віцебскага павету).

### *Карагоды*

«ЛЯЦЕЛІ ДЗВЕ ПЦІЧКІ» — карагод, вядомы славянскім народам. Выканаўцы рухаліся па крузе простым, рытмізаваным крокам і жэстамі, рухамі паказвалі ўсё, аб чым спявалі: махалі рукамі нібы крыламі, прысядалі і ў канцы цалаваліся. Мелодыя запісана на Гродзеншчыне:




Ляцелі дзве пцічкі ростам невялічкі.
Вось раз! Вось і два, вось і мілая мая!*
Ляцелі, ляцелі, селі — пасядзелі.
Селі, пасядзелі, усталі — паляцелі.
Як яны ляцелі, усс людзі глядзелі.
Як яны віталіся, салодка цалаваліся.

Іншы раз усе рухі выконваў саліст у цэнтры круга, а сататнія спявалі. Гэты карагод прыгодны для самых маленькіх.

*Прыпеў паўтараецца пасля кожнага радка. (Чурко Ю. Вянок беларускіх танцаў).

### *Лічылкі*

Аты-баты, шлі салдаты.
Аты-баты, на базар,
Аты-баты, што купілі?
Аты-баты, самавар.

Аты-баты, колькі стоіць?
Аты-баты, два рубля.
Аты-баты, хто выходзіць?
Аты-баты, гэта я.

(Дзіцячы фальклор. Зап. Г. А. Барташэвіч і В. І. Ялатаў у 1971 г. у в. Хацежына Мінскага раёна ад вучняў пачатковай школы).

### *Жарты*

#### Скупы пан

- Даў табе, дзедку, грош?
- Даў, пане!
- Дык памятай, што даў табе, дзедку, грош!
- На табе, паночку, другі. Толькі ўжо не кажы нічога.

(Жарты… № 63).

### *Гульні*

#### Цот і лішка

Гэтай гульнёй больш займаюцца хлопчыкі. Усе ўдзельнікі загадзя запасаюцца простымі і коланымі арэхамі. І затым адзін, на каго ўпадзе жэрабя або выбар з агульнай згоды, бярэ жменю арэхаў у руку, заціскае яе ў кулаку і пытае сябра, які стаіць побач: "Ці цот, ці лішка?" Калі ён адгадае, то арэхі, што знаходзяцца ў кулаку, пераходзяць да яго; калі ж не, то ён павінен аддаць столькі ж арэхаў, колькі іх было ў руцэ. Тое ж самае робяць па чарзе паміж сабою і іншыя пары ўдзельнікаў гульні. Іншы раз, калі няма арэхаў, гуляюць такім чынам і ў каменьчыкі, але вельмі рэдка. Гэтая гульня адрозніваецца ад іншых падобных той перавагаю, што яна не патрабуе мнагалюдства: для яе дастаткова адной пары ўдзельнікаў.

(Гульні, забавы, ігрышчы. Зап. у Гродзенскім павеце, з паведамленняў І. О. Карскага).

### *Святы і прысвяткі*

**Першы Спас** (Макавей, Макава, Макаўе, Першы Спас, Спас Мядовік, Медзяны Спас) -- свята маку і мёду, якое каталікі адзначаюць 1, а праваслаўныя 14 жніўня. Праводзілі абрады з макам , ужывалі ў ежу, рабілі варэнікі з мёдам, а таксама елі тое, у што можна было макаць. Асвячалі ваду, зёлкі, садовыя кветкі, моркву, сланечнік. Елі пірагі з макам і моркваю. Ведалі: на Макавея трэба ўволю наесціся маку. На Тураўшчыне "глухі мак свецілі і осыпалі хлеў, хату от небожчыкаў. І ек на суд ішлі , то кругом себе осыпалі" (Тураўскі сл., 1984). Варажылі: "Макавею, Макавею, я на цябе канапелькі сею. Скажы мне, Макавею,дзе мая пара, каб я з ім у гэтую ноч канапельку брала" (Брагінскі раён). Пчалаводы правяралі пчол, "макалі ў мёд нажы". Для збору мёду ўсе апраналіся па-святочнаму. Хаця і частаваліся перад асноўнай падзеяй, але без гарэлкі і закускі з рэзкім пахам. Раней запальвалі дымар "жывым агнём", выкарыстоўвалі свянцоную ваду. У гэты дзень надавалася вялікая роля и вадзе, праводзілі "вадзяную атправу"--крыжовае шэсце да вадаёма .

Існавалі прыкметы: "Як на Юр'я дождж--будзе рыбы многа, а на Макава--будзе многа грыбоў" ; "Калі на Макаўе не бывае дажджу, то будзе шмат пажараў" .

Свята ўсебакова адлюстравана ў народнай творчасці. У валачобных песнях зазначаецца: калі Ілля "жыта зажынаіць залатым сярпом", то "Святы Макавей з поля сабіраіць", "Святы Макавей бульбы накапаў, ...рабят накарміў". Прыказкі сцвярджаюць: "Першы Спас--провады лета", "Ад Першага Спаса халодныя росы" .

***

**Другі Спас** (Яблычны Спас, Спас, Вялікі Спас, Сярэдні Спас, Іспас), свята садавіны (6 і 19 жніўня). Асвячаюць садавіну, пасля чаго дазвалялася ўжо есці яблыкі, грушы, слівы. Таму і гаварылі:"Добра яблычка к Іспасу". Да гэтага не дазвалялася есці яблыкі, бо яны лічыліся грэшнымі пладамі. Згодна Бібліі, змей-спакушальнік праз яблык зрабіў грэшнай Еву.Таму першыя плады неабходна было асвяціць у дзень Пераўтварэння Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста. Асвячалі таксама мёд, каласкі новага ўраджаю. Усё можна было ўжываць у ежу, аб чым і сцвярджала прыказка: "Спас -- усяму час". Пачыналі сеяць азіміну.

Да ўсходу сонца праводзілі абрад выгнання клапоў. "Прыйшоў Спас, штоб не было клапоў у вас!". Паколькі на тую пару з'ўляецца шмат аваднёў, таму ў Лельчыцкім раёне кажуць: "Прыйшоў Спас, то пабярэ чорт і нас".

Надвор'е становіцца халаднейшае і наогул лічыцца, што ўжо скончылася лета. "Прыйшоў Спас -- і лета ад нас"; "Першы і Другі Спас -- бяры рукавіцы ў запас". У валачобных песнях спяваецца:

Святы Спасік, пільны часік,
Жытцо возіць, Бога просіць:
--Перанясі, Божа, маё жытцо...
праз гумянцо.

А святы Іспас, старэнькі дзядок,
На восець садзіў, жыта малаціў.

Святы Іспас
Яблыкі свенціць...
Ён гнаі возіць...
Жыта пасвяшчаіць.

Царкоўнае святкаванне звязана з біблейскімі падзеямі. Ісус Хрыстос збіраўся ў апошні раз ісці ў Іерусалім. На гары Фавор яго вучні ўбачылі нечакана пераўторанага Ісуса (у белым адзенні, асветлены сонцам твар) і пачулі нябесны голас: "Гэта ёсць Сын Мой Любімы, у Якім Мая добрая воля, Яго слухайце". Значэнне пераўтварэнне ў тым, што Хрыстос паказаны не як адзін з роўных апосталаў, а які стаіць над імі.

У сербаў царкоўнае Пераўтварэнне аддзяляе лета ад зімы. Замест яблыкаў амаль такую ж ролю як у нас займае вінаград. Пасля асвячэння яго можна ўжо было ўжываць. Вынімалі соты з вулляў, забаранялася купацца, існавалі іншыя павер'і і прыкметы. У румын, акрамя таго, у гэты дзень стараліся не крыўдзіць дзяцей і суседзяў.

# Лік 3

## *Прыказкі і прымаўкі*

Абыякі двойчы робіць, а скупы тройчы плаціць.

Адзін сын – не сын, два сыны – паўсына, а толькі тры сыны – сын.

Адна ралля – два сярпы, дзве раллі – тры сярпы.

Адна бяда – не бяда, дзве бяды – паўбяды, а калі трэцюю напаткаеш, тады бяду спазнаеш.

Адсунься ты, то сядзе тры!

Баба качаргу мяняла, тры дні гуляла.

Баязліўцу адзін пень за тры ваўкі здаўся.

Дзе двое зваду вядзе, там трэці крадзе.

Дзе двое сварацца, там трэці карыстаецца.

На рабоце «ой» ды «ох», а за сталом адзін за трох.

Нашто той вох, калі мы ўтрох.

Не хвалі каня трэцяга дня, а хвалі трэцяга году.

Не хвалі нявестку ў тры серады, а пахвалі ў тры гады.

Не хваліся ў тры дні, а хваліся ў тры гады.

Першыя пеўні – поўнач, другія пеўні – пара ўставаць, трэція пеўні – пярэдсвет.

Схавай свае тры грошы.

Трох не злічыць.

У вераб'я багатая сям'я: у кожнага верабейкі па тры капейкі.

У тры секачы сякуць, аднаго рака пякуць.

Упрасіліся злыдні на тры дні, а за тры гады не выжывеш.

## *Фраземы*

Да трох не гавары = Жарцікі кароткія – Шутки плохи.

Свае тры грошы ўваткнуць = Нос уваткнуць (уторкнуць, увапхнуць, усадзіць) = Тры грошыкі прыткнуць = З языком выткнуцца (улезці) – Сунуться со своим носом.

Тры чвэрці да смерці (тры чэрткі да смерткі) = Адну пятніцу жыць засталося = Пара да двара = Пара да Адама –При последнем издыхании.

## *Загадкі*

Адзін лье, другі п'е, трэці расце. (Дождж, зямля, трава).

Адзін ляжыць, другі бяжыць, трэці паклоніцца і тут стаіць. (Вада, зямля, дрэва).

Адзін кажа: «Пабяжым», другі кажа: «Паляжым», а трэці кажа: «Пахістаемся, ды тут застанемся». (Вада, снег, трава).

Адзін кажа: «Світай, Божа!», другі кажа: «Не дай, Божа!», а трэці кажа: «А мне ўсё роўна, ці дзень, ці ноч». (Вакно, дзверы, стол).

Адно ноччу глядзіць і днём глядзіць, другое ноччу не адпачывае, а трэцяе і днём, і ноччу не адпачывае, (Вокны, ложак, зямля).

Была ў мяне каморка на тры вуглы і поўна мукі. (Грэчка).

Два браты пузатыя на гару бягуць, а трэці гарбаты за чубы трымае, (Вёдры на каромысле).

Іванец, на двух канцах рубец, а два катлы нясе. (Каромысел і вёдры).

Ляцелі тры вароны. Селі на вароты, сталі кукаваць, Перша: «Мне лета летаваць». Другая: «Мне зіму зімаваць». А трэцяя: «Мне ўсё роўна». (Калёсы, сані, конь).

Ляцелі тры галіцы, палі-селі на мяліцы. Адна кажа: «Мне ўлетку лепей». Другая кажа: «Мне ўзімку лепей». Трэцяя кажа: «Мне ўсё роўна, што ўлетку, што ўзімку». (Калёсы, сані, конь).

Ляцелі тры галубы, селі на прарубы: адзін утапіўся, а двое кукуюць, пакуль таго ратуюць. (Вёдры і каромысел).

Тры арлы арлююць, чужое яечка балуюць. (Кум. Кума, поп пры хрышчэнні дзіцяці).

Тры братца пайшлі на раку купацца, два купаюцца, а трэці на беразе валяецца. (Вёдры і каромысел).

Тры браты на адным кані па белым полі едуць. (Пальцы, ручка, папера).

### *Загадкі-задачы*

Дзве дачкі, дзве мацеры і бабулька з унучкай? Колькі ўсіх?

(Трое: бабка, маці, дачка). Маладзечна.

***

Ішоў брат з сястрою імуж з жонкаю, знайшлі тры сыры. Як яны падзялілі?

(Па аднаму сыру). Капаткевіцкі р.

***

Вёз адзін чалавек ваўка, казу і капусту. Воўк усё хоча казу з'есці, а каза — капусту, ён ім не дае. Прыехаў да рэчкі. Трэба яму перавезці іх на той бераг. А човен маленькі, больш як дваіх не возьме: або яму браць з сабою ваўка, або казу, або капусту. Прыйдзецца некалькі разоў ездзіць. Задумаўся чалавек. «Як жа мне перавезці, каб бяды не выйшла. З ваўком паеду — каза капусту з'есць. З капустай паеду — воўк казу з'есць. Казу павязу, а на другі раз як зрабщь?»

(Спачатку трэба перавезці казу, потым — ваўка, а казу забраць назад. Пасля перавезці капусту і, нарэшце, вярнуцца забраць казу).

### *Жарты*

#### Разумны хлопец

- Чаго плачаш, Янук?
- Капейку згубіў.
- Вось табе дзве, толькі не плач.

Янук узяў дзве капейкі, схаваў ды і зноў плача!

- Ды чаго ж ты пачаш?
- Як жа мне не плакаць? Як бы не згубіў гэтай капейкі, дык меў бы ўжо тры.

(Жарты…№ 675).

***

#### Хіба трэці кум патрэбен?

- Ты адукаваны чалавек, а дзіця хрысціў з двума кумамі.
- А хіба трэці патрэбен.

(Жарты… № 714).

### *Забаўлянкі*

Чэ-чэ, сарока
Прыляцела із далёка,
На прыпечку сядзела,
Дзеткам кашу варыла.
Аднаму дала, другому дала.
А ты, мал, круп не драў,
Вады не насіў,
Кашы не палучыў.

(Дзіцячы фальклор. Зап. у в. Студзёнкі Нясвіжскага раёна ад Т. Гурын).

***

Бег бай па сцяне
У чырвоным каптане,
Нёс трое лапцей:
І жане, і сабе,
І дзіцёнку па лапцёнку.
Баіць ці не?
- Бай!

(Дзіцячы фальклор. Зап. у в. Чэрсвя Ушацкага раёна Віцебскай вобл.).

### *Песні*

**Былі ў бацькі тры сыночкі…**

Былі ў бацькі тры сыночкі.
Цю-лю-лю. *
Ды ўсе тры Васілёчкі.
Адзін козачкі пасе.
Другі лапцікі пляце.
Трэці сядзіць на каменю.
Дзяржыць дуду на раменю.
Як зайграе та дуда.
Ды з высокага дуба.

*Паўтараецца пасля кожнага радка.

(Дзіцячы фальклор. Зап. В.І. Ялатаў у 1957 г. у в. Доўгае Жалудоцкага раёна Гродзенскай вобл. ад Т. В, Місевіч, 47 г.).

### *Вясельныя*

Зборная суботка настала,*
Марыська дзевачак збірала.
Сабраўшы, ў радочак садзіла.
Сама села, малада, між іх,
Схіліла галоўку ніжэй усіх.
- Дзевачкі, сястрыцы вы мае,
Звіце ж вя вяночак для мяне,
Звіце ж вы вяночак з трох кветак:
Першая кветанька – рутанька,
Другая кветанька – мятанька,
Трэцяя кветанька – лілея,
Хай па мне матулька не млее.

*Кожны радок паўтараецца.

(Вяселле. Песні. № 537. Зап. у в. Ружаполле Астравецкага р. ).



***

## Із суботанькі на нядзельку гадзіна…




Із суботанькі на нядзельку гадзіна,
Сабралася ўся Любіна радзіна,
Прынесла ж яна тры пуды мукі на каравай, --
Хваліць Бога, вялікі будзе наш каравай,
Шчасліва будзе наша Любачка.

Із суботанькі на нядзелю гадзіна,
Сабралася ўся Любіна радзіна,
Прынесла яна тры гарцы солі на каравай, --
Хваліць Бога, салон будзе наш каравай,
Шчасліва будзе наша Любачка.

Із суботанькі на нядзелю гадзіна,
Сабралася ўся Любіна радзіна,
Прынесла яна тры капы яец на каравай, --
Хваліць Бога, будзе прыгож наш каравай,
Шчасліва будзе наша Любачка.

(Вяселле. Песні. № 5. Зап. Г. К. Антонаў у 1963 г. у Любанскім р. ад М. К. Макаед).

### *Лічылкі*

Едзе брычка, званок звоне,
Выйшла пані лічыць коні.

Раз, два, тры,
Выйдзі, малы, ты.

(Дзіцячы фалькор. Зап. В. М. Цыбікава ў 1948 г. у в. Лежайка Пружанскага раёна Брэсцкай вобл. ад І. Клімашэвіча, 9 г.).

***

Сядзіць немец на паліцы,
Лічыць дзеці на вуліы:
Айн, цвай, драй –
Міша, вылятай.

(Дзіцячы фальклор. З дзіцячых успамінаў Л. М. Салавей з в. Навасёлкі Мядзельскага раёна Мінскай вол.).

***Замовы***

**Бяльмо**

Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Божай Маці пакланюся.

Першым разочкам, лепшым часочкам. Бегла тры харты: адзін сіні, другі белы, трэці чорны. Сіні кажа «гам», белы кажа «гам», а чорны зусім «гам».

А ў нядзелю раненька яшчэ сонца не ўсходзіць, сам Госпад па небу ходзіць. За сабою тры кролікі водзіць. На сінім едзе, белым паганяе, а чырвоненькім добранькім з вочка боль зганяе.

Другім разочкам, лепшым часочкам… *(Тры разы).*

(Зап. Лозка А. у 1979 г. у в. Прыбалавічы Лельчыцкага раёна ад Гаўрылавец Саламоні Агееўны, 69 г.).

***

**Прысуша**

Госпаду Богу памолюся, Прачыстай Божай Маці паклонюся. Божая Маці з прастолу ўставала, рабабожай (*імя…)*дапамогу давала.

Першым разочкам, лепшым часочкам. У небе ёсць тры зарніцы, яны ўсе тры сястрыцы: адна прывара, другая прынуда, трэцяя прысуша. Прывара прыварыла, прынуда прынудзіла, прысуша прысушыла рабабожага *(імя…)* да рабабожай *(імя…).* Як не можа маці без дзіцяці, карова – без цяляці, асліца – без асленяці, каб так *(імя…)* не мог пражыць без *(імя…).* Колькі ў годзе празнічкоў, прынясі, госпадзі, *(імя…)* столькі памочнічкоў.

Другім разочкам, лепшым часочкам. *(Далей паўтараецца той жа тэкст).*

Трэцім разочкам, лепшым часочкам. *(Зноў паўтараецца той жа тэкст).*

(Зап. Лозка А. У 1979 г. у в. Букча Лельчыцкага раёна ад Сушчык, маладой жанчыны. Любоўная замова).

***Казкі***

**Кароль і стары дзед**

Жыў кароль. Было ў яго тры прафесары. Усе інстытуты прайшлі, усе акадэміі закончылі. Сталі яны гаварьщц каралю, што ўсё ведаюць. Кароль гаворыць ім:

— Паедзем са мною.

Едуць, а стары дзядок, не вучоны, сее і арэ.

— Што гэта на гары снег? — пытае кароль.

— Час прыйшоў,— говорьщь дзядок.

— Колькі ты разоў гарэў? — пытае кароль.

— Два,— адказвае дзядок.

— Колькі будзеш гарэць?

— Тры.

— Тады я да цябе прышлю трох гусакоў,— гаворыць кароль, -- іх трэба чысценька абскубсці.

— Добра.

— Што мы ўчора гаварылі з дзядуляю? — пытае кароль назаўтра ў сваіх прафесараў. Яны не адказалі

— Я вам галовы паздымаю, — узлаваўся кароль, — калі не адкажаце на маё пытанне.

Узяліся яны за кнігі. Усе перабралі, анічога не знайшлі. Пайшлі яны да старога дзядулі

— На гары снег — гэта валасы на галаве белыя,— гаворыць .дзядуля.— Два разы гарэў — дзве дачкі замуж аддаў; тры разы гарэць буду — трох дачок аддаваць буду; а тры гусакі — гэта вы, вучоныя людзі. Вось я вас і абскуб.

Падзякавалі гусак беламу снегу на гары і пайшлі дадому. Вось як бывае.

(Казкі ў сучасных запісах. Зап. В. І. Скідан у 1965 г. у в. Солаўе Аршанскага раёна ад Е. П. Лосева). Можна таксама выкарыстаць іншыя творы, напрыклад, «Сын прададзены» («Беларускія народныя казкі». С. 289-299).

## *Святы і прысвяткі*

**Трэці Спас** (Малы Спас, Хлебны Спас, Арэхавы Спас**)**—адно са свят хлеба.

Шмат дзе спраўлялі дажынкі—свята канца жніва. Упрыгожвалі стужкамі і кветкамі «бараду». Ахвяравалі хлеб і соль духу нівы, відаць Воласу, казлападобнай істоце. «Воласаву бародку» жнеі неслі гаспадару і ставілі ў кут. Зерне і каласкі ўжывалі на працягу ўсяго года ў розных магічных абрадах. На Палессі, напрыклад, «вылівалі Волас»--пры дапамозе каласкоў вады і замовы: «Волас, Волас, выйдзі на чысты колас...» перасцерагалі ад зубнога болю.У іншых раёнах «лячылі» «валасень».

Канец жніва і змена надвор'я адлюстраваны ў прыказках: «Трэці Спас хлеба прыпас»; «Па Трэцім Спасе трымай рукавіцы ў запасе» і інш.

У некаторых раёнах гэты дзень яшчэ называюць Арэхавым Спасам, бо раней у царкве асвянчалі арэхі, якія нарыхтоўваліся дзецьмі.

Яшчэ К.Машынскі ў 1914 г. зафіксаваў, што на Усходнім Палессі «На дажынкі падаюць чвэрць гарэлкі і пеўня; або пеўня, яечню, рыбу і парася; певень абавязкова павінен быць». Згадкі аб рытуальнай страве фіксуюць і сучасныя крыніцы (Тураўскі сл., 1983. С. 27; 1987. С. 412). Жніўныя рытуальныя стравы з пеўнем вядомы народам Еўропы, дзе даследчыкі лічаць іх рэшткамі ахвярапрынашэння .

Міфалогія жніва найбольшае развіццё і захаванасць атрымала ў беларускіх абрадах і жніўнай паэзіі. У нас існуюць такія вобразы як Багач, Жыцень, Жытняя Баба, Спарыш, Рай (Раёк). Аналізуючы погляды вучоных на дажынкавыя песні, А.Ліс не без падстаў бачыць у двух апошніх, што звязаны з жытняй «барадой», «як міфапаэтычнае ўвасабленне ўрадлівасці, якое ў вачах славян-язычнікаў мела функцыі дабратворнага боства. Царква адзначае дзень памяці перанясення з Едэсы ў Канстанцінопаль Нерукатворны Абраз (Убрус) Госпада Ісуса Хрыста (944 г.).

У рускіх «барада» больш ахрысціянілася. Аб гэтым сведчаць яе назвы ў розных рэгіёнах: борода Илья-пророку, Ильюшкина борода, Николе на бороду, борода Фролам-Лаврам, Христу на бородку . На Украіне перад жнівом «завівалі бараду Воласу».

Падобны абрад заяршэння жніва існаваў, напрыклад, у Францыі (Латарынгія, першая пал. XIX ст.). Жнец, які першы зразаў апошнія каласкі аб'яўляўся «каралём букета», атрымліваў права звязаць апошні сноп і выбраць сабе «каралеўну». Пара ўсяляк

ганаравалася. Адметным было тое, што апошнія каласкі поля былі каля ўтыкнутай у зямлю галінкі («Май»), якая ўпрыгожвалася стужкамі і кветкамі, і на вяршыні знаходзіўся прывязаны жывы певень, што станавіўся пасля рытуальнай стравай. У Нармандыі апошні сноп называлі «каралевай» і вадзілі вакол яго карагод. Сербы і чарнагорцы называлі яго божай барадой (божја, богова, богу барада). Югаслаўскія даследчыкі звязваюць апошні сноп, з ахвярай язычніцкаму боству Дабогу, ці духу зерня, ці нейкаму невядомаму . Французкія даследчыкі таксама бачаць у жніўных абрадах адгалоскі язычніцтва, народныя ўяўленні звязваюць з раслінным духам, які захоўваецца ў апошнім снапе . Народы Бельгіі і Нідэрландаў у апошнюю нядзелю ліпеня святкуюць Нядзелю жняца (Maaierszondag ag maaier – галандск. – касец, жнец). Яшчэ ў некаторых правінцыях можна ўбачыць упрыгожаныя дамы па-даўняму звычаю снапамі жыта і аўса, дзяўчаты ў час жніва носяць шырокаполыя шляпы, а мужчыны-касары абвешаны кветкамі .

Абрады з апошнім снапом і пеўнем вядомы многім народам і іх дахрысціянская сутнасць не выклікае сумнення. Так, яшчэ ў ХУІ ст. у ніжненямецкіх землях апошні сноп сяляне прысвячалі язычніцкаму боству Водану, апекуну ўраджая . Шырокае развіццё атрымалі абрады і гульні з пеўнем, дух якога знаходзіцца ў апошніх каласах жыта. Іх зразаць у некаторых раёнах Германіі даручалі нявесце, ці цнатлівай дзяўчыне. Жыту апошняга снапа таксама прыдавалася магічнае значэнне. Важным атрыбутам выступаў і вянок. У Польшчы праводзілася забава «Біць пеўня» (Kokota bic). Хлопцы з закрытымі вачыма стараліся разбіць палкамі гаршок з пеўнем. Пераможца станавіўся «каралём». Даследчыкі звязваюць даўні абрад з «рэшткамі старажытнай крывавай ахвяры» . У нашых суседзяў «дажынкі» складаліся таксама з чатырох асноўных частак: абраду з апошніх каласкоў, працэсія з імі, уручэнне снапка гаспадару і частаванне. Падобныя жніўныя абрады, звязаныя з «барадой», апошнім снапом, існавалі і ў далёкай Грэцыі.

## Лік **4**

### *Прыказкі і прымаўкі*

Наш Васіль на работу не сіл, а як клёцкі ў малаку – за чатырох павалаку.

На ўсе чатыры нагі падкаваць.

Рабіць на Васіль не мае сіл, а клёцкі ў малацэ – за чацвярых валачэ.

### *Загадкі*

Адзін голасна чытае, двое ў кніжку паглядае, двое трэціх слухае. А чацвёрты нюхае. (Рот, вочы, вушы і нос).

Адно бруха, чатыры вуха. (Падушка).

Два вочкі, чатыры лапкі і пуза гладка. (Жаба).

Два кані, а чатыры хвасты. (Лапці і аборы).

Дзве свецяць, чатыры сцелюць, адна спаць лажыцца. (Сабака).

Дваяног, дваяног, вазьмі мяне без ног, бо прыйдзе чатырыног і з'есць мяне без ног. (Чалавек, яйцо, свіння).

Зранку ходзіць на чатырох нагах, удзень – на дзвюх, а ўвечары – на трох. (Чалавек у розным узросце).

Мае чатыры нагі—не пойдзе, мае пух і пер'е – не паляціць, мае душу, але не заўсёды. (Ложак).

На чатырох кіёчках ляжыць дошка. (Стол).

Пад адной крышай чатыры браты стаяць. (Стол).

Пад адной шапкай чатыры панічыкі жывуць. (Стол).

Пяе петушок з чатырох кішок. (Скрыпка).

Чатыры браты даганяюць адзін другога і ніколі не дагоняць. (Колы ў возе).

Чатыры братцы-барадатцы. Як у лес вядуць – дамоў глядзяць, як з лесу ідуць – у лес глядзяць. (Капыты ў каня).

Чатыры заловачкі схілілі галовачкі пад адным капелюшом. (стол).

Чатыры ладкі плешчуць, дзве зорачкі гараць, дзве свечачкі стаяць і тысяча свішчуць. (Конь).

Чатыры нагі, але не звярушка, многа пер'я, ды не птушка. (Ложак з падушкамі).

Чатыры нагі маю, але не звер, пух і пер'е маю, але не птах, душу і цела маю, ды не чалавек. (Ложак).

Чатыры цыганачкі ільюць у адну баначку. (Карова).

Чатыры чатыранечкі пабеглі ў палянечкі, ды злавілі вутку і пасадзілі ў кутку. (Воз са снапамі).

Чатыры чатырачкі і дзве растапырачкі, сёмы вяртун. (Вяроўка, калыска, дзіця).

У мыкалы чатыры дыкалы, а ў іржы дзве. (Карова і кабыла).

У рагулі чатыры дулі, а ў гарцапкі дзве. (Карова і кабыла).

У рагулі чатыры гулі, а ў ржулі дзве. (Карова і кабыла).

У раніцы – на чатырох конях, удзень – на пары, а ў вечары – на трох конях. (Чалавек у розным узросце).

Як малы быў – у чатыры дудкі іграў, як падрос – горы варочаў, а на старасць у танцы пайшоў. (Бык).

### *Загадкі-задачы*

Ляцелі галкі, стаялі палкі. Як сядуць яны па адной – галка лішняя, як сядуць яны па дзве – палка лішняя. Колькі было галак і колькі было палак? (Тры палкі і чатыры галкі). Капаткевіцкі р..

***

Сядзіць у кругу чатыры кошкі, супраць кожнай кошкі па тры. Колькі было разам? (Чатыры). Кіраўскі р.

***

Як паставіць чатыры салдаты ў адным боце? (Зняць у кожнага па аднаму боту).

***

Запалілі чатыры свечкі. Адну патушылі, колькі засталося? (Адна). Кіраўскі р.

### *Жарты*

#### Боты

- Як непрыемна насіць боты першыя тры дні.
- Дык вы абувайце толькі на чацвёрты.

### *Лічылкі*




Раз, два, тры, чатыры,
Кошку грамаце вучылі:
Не чытаць, не пісаць,
А за мышкамі скакаць.

(Дзіцячы фальклор. Зап. В. І. Ялатаў у 1971 г. у в. Волма Мінскага раёна ад дзяцей).

# Лік 5

### *Прыказкі і прымаўкі*

За пяць пальцаў не купіш.

### *Фраземы*

Пятае клёпкі бракуе = Трэцяй бэлькі нестае = Без пятай дошчачкі = Не тое што клёпкі, але і абруча няма – Заклепки не хватает.

Пятае кола ў возе = З пустога хлява пустое цяля = Гарэлы блін – Пришей кобыле хвост.

Як пятае кола ў возе (да воза) = Як сабаку другі хвост – Как собаке пятая нога.

### *Загадкі*

Адзін гаворыць, двое глядзяць, двое слухаюць. (Язык, вочы, вушы).

Два стаяць. Два ляжаць, а пятая хода ходам ходзіць. (Вушакі і дзверы).

Дзве маткі маюць пяць сыноў, а кожны з іх адно імя. (Рукі і пальцы).

З пяці бэляк хату строяць, а ўсе бэлькі цэлыя застаюцца. (Пруткі для вязання).

Зямля белая, насенне чорнае, пяцёра аруць, двое сочаць, адзін кіруе. (Кніга і чалавек).

Пад страхою пяць паненак мокрыя, а па дарозе пяць сухія ідуць. (Пальцы жанчыны, калі яна прадзе кудзелю).

Пяць авечак стажок скубуць, а пяць дарожкай бягуць. (Прадзенне).

Пяць братоў у адну ноч нарадзіліся. (Пальцы).

Пяць братоў у адну ноч нарадзіліся, а ростам не роўныя. (Пальцы).

Пяць ваўкоў пад страхой, пяць на двары: што пад страхой, тыя мокрыя, што на двары, тыя сухія. (Пальцы,калі прадуць пражу).

Пяць козак смокчуць стожак, а пяць у поле ідуць. (Пальцы і кудзеля).

Пяць раз гарэў, адзін раз будаваўся. (Пяць дочак замуж аддаваў і аднаго сына жаніў).

Пяць уцякае, а пяць даганяе. (Пальцы ў час прадзення).

Пяць хлопчыкаў, пяць гулёнчыкаў, кожны хлопчык у свой гулёнчык. (Пальчатка).

Чатыры чатырнічкі: на кожным чатырнічку па пяць пяцернічкаў. (Рукі, ногі, пальцы).

### *Загадкі-задачы*

Пералічыце пяць дзён папарадку, не называючы лікаў і назваў дзён.
(Пазаўчора, учора, сёння, заўтра, паслязаўтра).

### *Забаўлянкі*

Піпа кашу варыла,
Малых дзетак карміла:
Аднаму дала, другому дала,
Трэццяму дала,
Чацвёртаму дала.

А ты, малы пальчык, ідзі,
Сам сабе кашы навары!
Тут — пень, тут — калода,
Тут — мох, тут — балота,
А тут — цёпленькая вадзіца.

(Дзіцячы фальклор. Зап. у 1939 г. у Даўгаўпілсе. З дзіцячых успамінаў В.Сахаравай).

Выкарыстанне.
Гуляць з пальчыкамі дзіцяці.

***

Сарока-варона
Дзеткам кашку варыла,
На прыпечку студзіла,
Памялом мяшала,
Чапялой давала.
Гэтаму дала,
І гэтаму дала,
І гэтаму дала,
І гэтаму дала,
А гэтаму не дала:
— Ты, малы, круп не драў,
Вады не насіў,
Дзяжы не мясіў.
Ідзі, малы, па вадзіцу
У сцюдзёную крыніцу,
За пень, за калоду
Па жывеньку воду!

(З рукапісных матэрыялаў М.Гарэцкага).

***

Сарока-варона
Кашку варыла,
Дзетак карміла:
Гэтаму давала,
Гэтаму давала,
Гэтаму давала,
Гэтаму давала...
А ты, пальчык,
Маленькі мальчык,
Схадзі па вадзіцу
У сцюдзёну крыніцу...
Тут мох,
Тут балота,
Тут пень,
Тут калода,
Тут крыніца,
Тут сцюдзёная вадзіца!

(Дзіцячы фальклор. Зап. М.Гарэцкі ў 1926 г. у в.Багацькаўка Мсціслаўскага раёна ад П. Гарэцкай).

## *Балады*

### За клеткаю, за новаю…




За клеткаю, за новаю,
Сад зялёны, вішнёвы *.
Ляжаць брусы цясовыя,
Па тых брусах сняжок выпаў,
Сняжок выпаў, слядок паклаў.
А хто ж там ішоў?
Красная паненка,
А за ёю красны панічок.
— Пастой, пастой, красная паненка,
Загадаю пяць загадак.
Адгадаеш — мая будзеш,
А не адгадаеш — слугой будзеш.
А што ляціць без повада?
А што гарыць без полымя?
А што расцець без кораня?
А што чорна не чэрнячы?
А што бела не белячы?
- Вада ляцщь без повада,
Зара гарыць без полымя,
Камень расцець без кораня,
Лебедзь белы не белячы,
Воран чорны не чэрнячы.

*Рэфрэн паўтараецца пасля кожнага радка.

(Балады. Кн.1. Зап. Г. І. Цітовіч у 1945 г. у в. Цінцэвічы Куранецкага раёна Маладзечанскай вобл. Спяваюць у Вялікі пост).

***Лічылкі***

Бег сабака цераз мост,
Чатыры лапы, пяты – хвост.

(Дзіцячы фальклор. Зап. Р. Ружа ў в. Рахманы Скайсценскай воласці Даўгапілскага павету).

***

Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Выйшаў зайчык пагуляць.
А за зайцам – серы воўк,
Ён жа ведае ў іх толк.

(Дзіцячы фальклор. Зап. Г. А. Барташэвіч у 1971 г. у в. Закор'е Браслаўскага раёна Віцебскай вобл. ад Алі і Валі Паўловіч).

***Гульні***

**Пяць імён**

Могуць прымаць удзел у гульні ўсе жадаючыя. Адзін бярэ мяч і гаворыць:

— Я знаю пяць дзевак:

Маня — раз,
Таня — два,
Люда — тры,
Света — чатыры,
Тома — пяць.
Я знаю пяць хлопцаў: (называе імёны).
Я знаю пяць гарадоў (называе).
Я знаю пяць рэк (называе).
Я знаю пяць красак (называе).

Потым па чатыры, па тры, па два, па аднаму. Калі мяч падае, гулец выходзіць з гульні, пачынае другі. Пераможца той, хто давядзе гульню да канца.

(Дзіцячы фальклор. Зап. Г. А. Барташэвіч у 1967 г. у в. Заполле Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобл. ад Ігнатовіч Валі, 10 г. і Ігнатовіч Мані, 9 г.).

***Жарты***

**Колькі вёрст да неба?**

Ідуць два дабрадзеі з кірмашу. І як пяць вёрстаў мінулі, так і адпачываць трэба: бо як пяць вёрст, так і карчма стаіць. Вось ідуць і загаварыліся.

- А што, -- адзін кажа, -- як бы падлічыць колькі вёрст да неба?
- А Бог яго ведае, колькі. Думка такая, што вёрстаў з пяць будзе.
- Цю на цябе, куме! Калі б пяць, то там бы карчма стаяла!
-

(Жарты… № 501).

***

**Ліпавы мёд**

Прыехаў селянін на рынак мёд прадаваць. Падышоў да яго поп і пытаецца:

- Які мёд?
- Ліпавы, адказвае селянін.
- А колькі просіш за кілаграм?
- Тры рублі…
- Усяго тры рублі? Хлус! У цябе не ліпавы мёд…

І пацягнуўся поп далей па рынку. А хітры селянін падхапіў бочку з мёдам і непрыкметна забег яму наперад.

- У цябе які мёд? – зноў пытаецца ў селяніна поп.
- Ліпавы, -- адказвае той.
- Колькі за кілаграм просіш?
- Пяць рублёў…
- Во гэта сапраўдны ліпавы! – задаволена кажа поп і лезе ў кішэню па грошы.

(Жарты… № 700).

***Казкі***

**Гусак, мядзведзь, воўк, лісіца, кабанец**

Жылі сабе дзедка ды бабка, і быў у іх гусак. Пайшоў гусак у Кіеў Богу маліцца. Ішоў ён, ішоў, аж бяжыць мядзведзь.

— Гусак, гусак, куды ты ідзеш?

— Пайду ў Кіеў Богу маліцца!

— Пайду і я з табой.

— Ідзі!

Вось ідуць удваіх. Бяжыць воўк.

— Гусак, гусак, куды ты ідзеш?

— Пайду ў Кіеў Богу маліцца!

— Пайду і я.

— Ідзі!

Вось ідуць утраіх. Бяжыць лісічка-сястрычка.

— Гусак, гусак, куды ты ідзеш?

— Пайду ў Кіеў Богу маліцца!

— Пайду і я з табой.

— Ідзі!

Вось ідуць учацвярых. Бяжыць кабанец.

— Гусак, гусак, куды ты ідзеш?

— Пайду ў Кіеў Богу маліцца!

— Пайду і я.

— Ідзі!

Вось ідуць упяцёх. Ішлі, ішлі яны доўга. Стаіць роў — шырокі, глыбокі. Сталі яны пераходзщь: гусак падняўся, пераляцеў і пайшоу сабе далей; мядзведзь разагнаўся — ды ў роу. Воўк разагнаўся -- ды ў роў.

— Ах ты, ваўчышча-дурачышча,— кажа лісіца,— во як я пабягу, дык і пераскочу! Як пабегла — ды ў роў. Кабанец разагнаўся — і той туды паляцеў. Сядзелі яны, сядзелі ў рове, захацелі есці. Лісіца і гаворыць:

— Ну, хто старэй, таго і будзем есці!

Кабанец кажа:

— Мне ад радоў ды пяць гадоў.

Затым воўк :

— Мне ад роду чатыры году.

Мядзведзь кажа:

— Мне ад роду ды тры году.

**А** лісіца:

— Мне ад роду ды два году.

Вось узялі і сталі кабанца есці. Пасля ўзяліся за ваўка. А лісіцща выкапала ямачку і нахавала туды кішак. З'елі ваўка; лісіца, седзячы на ямачцы, цягае з-пад сябе кішкі ды есць. А мядзведзь просць:

— Лісічка-сястрычка! Дай і мне хоць адну кішачку!

А лісіца гаворыць:

— Ах ты, мядзведзішча-касалапішча! Ты ж бачыш, як я лапай цягаю з жывата. Вось вазьмі ды лапай сам з сябе цягай дый еш!

Мядзведзь паслухаў, лапай кішкі зачарэпіў і цягне, ды сам сябе разарваў і здох. Лісіца яго і з'ела. А пасля і няма чаго есці. Вось яна і пайшла па рву. Бачыць — стаіць дуб; на тым дубе дзятлавае гняздо. Ліса і кажа:

— Дзяцел, дзяцел, выдаўбай мне лесвічку, дык не буду тваіх дзетак есці; а калі не выканаеш просьбу, дык узлезу і дзяцей паем.

Вось дзяцел даўбаў, даўбаў, выдаўбаў лесвічку, дык лісіца палезла па ёй і паела дзятлавых дзетак.

(Беларускія народныя казкі. Зап. Е.Раманаў у 80-х гадах XIX ст у Гомельскім павеце).

# Лік 6

### ***Прыказкі і прымаўкі***

Дзе кухараў шэсць.там няма чаго есць.

### ***Загадкі***

Два стаяць, два ляжаць, пяты ходзіць, шосты водзіць. (Касякі, дзверы і чалавек).

Два стаяць, два ляжаць, пяты ходзіць, за пуп водзіць, шосты песенькі спявае. (Дзверы, вушакі і чалавек).

Дзве галавы, дзве спіны, шэсць ног, адзін хвост. (Чалавек на кані).

Дзесяць ног, шэсць вачэй, тры галавы ў адзін бок. (Араты з парай валоў або коней).

Шэсць ног, дзве спіны і адна галава. (Чалавек у крэсле).

На двары стаіць гара: чатыры тыкі, дзве матыкі, сёмы замахайла. (Карова).

Чатыры чаркі, пятая лубяная, а шостая каханачка. (Каляска і дзіця).

Чатыры чатыркі, пятая растапырка, шостая жывушка. (Калыска і дзіця).

Чатыры чатырнічкі, пятая падушка, шостая жывушачка. (калыска з дзіцём).

Чатыры чатырначкі, дзве растапырначкі, пятая пяёначка, а шостая ляжоначка. (Калыска, маці. Дзіця).

Чатыры чатырнічкі, пяты паўнірнічак, шосты просты нясе крывулечку паміж тых ды ў вулечку. (Лыжка).

Чоран, ды не воран, рагат, ды не бык, шэсць ног без капыт, ляціць – вые, сядзе – зямлю рые. (Жук).

Чорны, ды не воран, шэсць ног без капыт. Як ідзе, то зямлю рые. (Жук).

*Загадкі-задачы*

Ішлі ўтраіх. Знайшлі кашалёк з грашыма. Першы паглядзеў, колькі там было грошай, і палажыў сваіх столькі ж, а пасля ўзяў шэсць капеек і перадаў другому. Другі паглядзеў, колькі там засталося, палажыў столькі ж і ўзяў таксама шэсць капеек, а потым перадаў трэцяму. Трэці паглядзеў, колькі там засталося, палажыў столькі ж і ўзяў таксама шэсць капеек, пасля чаго ў кашальку нічога не засталося. Колькі там было грошай?

(Пяць капеек в чвэрцю). Капаткевіцкі р.

*Песні*

Да на гары дубочак,
Да на гары зялёны,
Да на тым дубочку
Да па чатыры лісточкі.
Да на небе месячык,
Да на небе ясненькі,
Да на тым месячыку
Да чатыры нядзелькі,
Да ў тых нядзельках
Да па шэсць дзянёчкаў.

(Дзіцячы фальклор. Зап. Мажаеўскі каля Молчадзі Навагрудскага павету).

*Балады*

**А што ў лесе ды на верасе…**




А што ў лесе ды на верасе,
Ой, зялёны явар кудравы *.
Пасвіла дзеўка тры стада коней.
Пасучы коней, яна й заснула.
Прачнулася дзеўка — коней няма.
Пайшла дзеўка лужком-беражком,
Стрэла дзеўка трох рыбалоўцаў.
Стала яна ў іх пытацца,
Ці не бачылі тры стада коней?
Адзін кажа: я не бачыў,
Другі кажа: я не бачыў,
Трэці кажа: я й сам там быў.
Загадаю, дзеўка, шэсць задачак,
Тады табе скажу, дзе твае коні.
А што расце без кораня,
А што бяжыць без повада,
А што бела да не белена,
А што чорна да не чэрнена?
- Камень расце без кораня,
Вада бяжыць без повада,
Белы лебедзь не белены,
А чорны воран не чэрнены.
- Цяпер скажу, дзе твае коні.
Твае коні ў чыстым полі
Ядуць траву медунічную,
А п'юць ваду крынічную.

*Рэфрэн «Ой, зялёны явар кудравы» паўтараецца пасля кожнага радка.

(Балады. Кн. 1. Зап. В. Р. Кушнарэнка ў 1973 г. у в. Збышын Кіраўскага раёна Магілёўскай вобл. ад Просі Чапняцовай).

### *Лічылкі*

Эна, бэна, рэсь,
Кэнтар, мэнтар, жэсь,
Эна, бэна, раба,
Кэнтар, мэнтар, жаба.

(Дзіцячы фальклор. Зап. М. Я. Грынблат у 1945 г. у в. Порса Куранецкага раёна ад Галі Санко, 12 г.)

***

Она, дуна, рэс,
Кіндэр, віндэр, рэс.
Она, дуна, раба,
Кіндэр, віндэр, жаба.

(Дзіцячы фальклор. Зап. М. Я. Грынблат у в. Ізбішча Плешчаніцкага раёна Мінскай вобл. ад хлопчыкаў 8 – 9 г.).

### *Гульні*

### **Шастак**

Дзяўчаты становяцца у кола, трымаючыся за рукі; адна з дзяўчат выходзщь у сярэдзіну кола, пахаджвае і пяе:




Шэсць дзён малаціла,
Шастак зарабіла.
Сама сабе дзівавала,
Што так мала зарабляла.

Прапеўшы гэта, яна, а за ёй і ўсе дзяўчаты пяюць гэту песню зноў спачатку; дзяўчына, што хадзіла пасярэдзіне, як найхутчэй пачынае перакручвацца цераз руку з тымі, што стаяць у коле. Калі яна перакруціцца з усімі, то на яе месца ідзе другая і зноў пяе:

Шэсць дзён малаціла,
Шастак зарабіла.
Сама сабе дзівавала,
Што так мала зарабляла.

(Дзіцячы фальклор. № 941. Сабрала і апрацавала Л. Чарняўская. Вільня, 1919).

### *Святы і прысвяткі*

**Шэсць дзеў** – прысвятак, які праводзіўся праваслаўнымі ў апошні дзень мая (траўня). На смаленскія беларусы гаварылі: “Лён сей позні на Шэсць дзеў”. Адну з сям’і, як на самай справе ў царкоўным календары, звалі Матрунай, таму дзень вядомы як Канапелька Матруна. “Канапелька Матруна ў зямлю махнула”.

# Лік 7

### *Прыказкі і прымаўкі*

Адзін з сошкаю, а сямёра з ложкаю.
Адным махам сем мух забіяхам.
Адным стрэлам сем качак забіў
Гаспадыня! Сем град – адзін бурак.
Гора адно не йдзе, а за сабою сем вядзе.
З сямі печаў хлеб.
Ліса семярых ваўкоў ашукае.
На сем двор адзін тапор, адзі рубіць, а шасцёра ў кулак трубіць.
На сем паганятых, адзін араты.
На сем сукоў садзіцца.
На год сем прыгод, а на веку – без ліку.
Не хваліся за сем дзён, а хваліся за сем год.
Сем капот ды голы жывот.
Сем паноў, двое штаноў; хто раней устаў, той штаны ўзяў.
Сем пятніц на тыдні.
Сем раз адмерай, а адзін раз адрэж.
Сем разоў глядзі, а назад не вядзі.
Сем разоў мер і то не вер.
Сем сёл. адзін вол і той гол.
Семера аднаго не чакаюць.
У адзін дзень сем перамен.

### *Фраземы*

Дзеля адной ежкі сем міль пешкі = За лыжку яды сем вёрстаў хады = Сем міль еду дзеля аднаго абеду = За хунт ляпешкі дзесяць вёрстаў пешкі -- За семь вёрст киселя хлебать.

Жывот на сем столак = Трыбух на тры полкі = Жывот як торба (як кубел, як цэбар, як бочка) -- Брюхо из семи овчин.

Сем карабоў наверзці = Лухту плесці (несці, малоць, мярзці) = Гарох з капустаю мяшаць = Боб з гарохам мяшаць = Мох з балотам несці = Абы-што вярзці (малоць) = Языком малоць = Не падсяваючы малоць (сыпаць) = Лухту непадсяваную лухціць = Плявузгаць – Нести (городить) околесицу (чепуху, чушь).

Сем пядзяў лоб = Чэрап густа варыць = Моцная галава = З двума віхрамі – Сями пядей во лбу.

Сем сабак не абрэша (не перабрэша) = Жаба на языку не спячэцца =На языку нічога не замерзне – На языку реку переедет.

Сем шкур здзерці (зняць, сагнаць) = У скуру зжарыць = На горкі яблык збіць = У кіслы яблык сцерці = На порхаўку збіць = Жыўцу дастаць = На штукі пасекчы – Спустить шкуру.

### *Прыкметы*

Каля Уласа сем марозаў: тры да Уласа, адзін на Уласа і тры пасля Уласа.
Сымон да варот, на двары сем пагод: сее, вее, муціць, круціць, зверху лье, знізу мяце.

### *Загадкі*

Гаршчок разумны, хоць сем дзірак мае. (Галава).

Гаршчочак вумён. Сем дырачак у ём. (Галава).

Два стаяць, два ляжаць, пяты ходзя, шосты водзя, сёмы песні пяе. (Дзверы).

Едзе кошка на шасцёх ножках, сама сёмая. (Тыдзень).

Ехала Машуха ў сямі паўшубках, хто на яе не гляне. Усякі заплача. (Цыбуля).

Крыкнуў вол на сем сёл, яго не відаці, а голас чуваці. (Царкоўны звон).

Лёг мост на сем вёрст, а на канцы макавы цвет. (Вялікі пост і Вялікдзень).

Прыйшлаха Эльжуха ў сямі кажухах. (Цыбуля).

Сем міль масту, а ў канцы цвет, ды на ўвесь свет. (Вялікі пост і Вялікдзень).

Скінуўся ўбок – застаўся хвост на сем вёрст. (Клубок нітак).

Стаіць мост на сем вёрст, у канцы маста стаіць яблыня, пусціла цвет на ўвесь белы свет. (Вялікі пост і Вялікдзень).

Сядзіць бабуля ў сямёх кажушках, хто яе прыбачыць, той пэўна заплачыць. (Цыбуля).

У адным клубочку ды сем дырачак. (Галава).

У адну пуньку ды сем варот. (Галава).

Чатыры татыркі, дзве тапатыркі, сёмы вярцель (Карова).

### *Загадкі-задачы*

Ляцела два статкі гусей. Першы статак гаворыць:

— Дайце нам адну гусь, тады ў нас будзе пароўну. А другі статак гаворыць:

— Дайце вы нам адну гусь, тады ў нас будзе ў два разы больш.

Колькі было гусей у адным і другім статку?

(Пяць і сем). Капаткевіцкі р.

***

Стаяла хатка, а ў ёй было сем акенцаў, і на кожным сядзела сем кошак, а ў кожнай кошкі было па сем кацянят. Колькі ў іх ва ўсіх было ног? Увайшоў і я ў хату і маіх было дзве нагі.

(Дзве нагі, а ў катоў – гэта ж лапы). Старобінскі р.

### *Песні*

**Парадзіла Чачотачка сямёра дзяцей…**



Парадзіла Чачотачка сямёра дзяцей,
Парадзіла невялікіх сямёра малых: Яўгеню, Аксеню
І Таццюху й Натуху,
І Рыпеню й Макрэню,
Сёмую Хімку*.

Парадзіўшы і зрасціўшы, замуж аддала,
Бадай сама Чачотачка здарова была!
Яўгеню за Мірона,
А Аксеню за Сапрона,
А Таццюху за Дзяміда,
А Натуху за Свірыда,
Радзівону — Рыпеню,
Харытону — Макрэню,
Хімку за Кузьму.

Як начала Чачотачка пасагу даваць,
Як начала невялікіх да усіх надараць:
Яўгені — паясок,
А Аксені — кажушок,
А Таццюсе — рукавічкі,
А Натусе — чаравічкі,
А Рыпені — пасцельку,
А Макрэні — калыбельку,
Хімцы — стужкі ўсе.

Паззывала Чачотачка брацяйкаў сваіх,
Паззывала Чачотачка брацяйкаў усіх:
Адзін быў Савасцей,
Другі быў Цялямней,
Быў Барыс і Дзямід,
І дудар, і ўдавец,
І слуга Карпец.

Былі дзеўкі на вяселлі і малодкі,
Яшчэ былі стары бабкі і ўдоўкі:
Кася, Яся, Барбуся,
Ды Хвядора, Настуся
І суседкі ўсе.

А Чачотачка не гуляла — варыла блаху,
Тры дні госці блаху елі, пакуль з'елі ўсю.
А на трэццюю нядзелю
Госці дамой захацелі,
Дзенкавалі за вяселле,
Ехалі дамой.

*Апошні радок кожнай страфы паўтараецца.

(Мінская вобласць. Зап. У в. Сіняўка Клецкага раёна ад Рэвякі А.М., 1920 г.н. Жартоўная песня).

### *Вясельныя*






Не ўгадае.

Ніхто не ўгадае,
Што ў нашым караваі,
Караваі.
Што ў нашым караваі
А з сямі палёў пшаніца,
Пшаніца.
А з сямі палёў пшаніца,
А з сямі крыніц вадзіца,
Вадзіца.
З сямі крыніц вадзіца,
З сямі кароў масла,
Масла.
З сямі кароў масла,
А яец паўтараста.

(Вяселле. Песні. Зап. Л.М.Салавей у 1973 г. у в. Уюн Быхаўскага раёна ад У. Грышчанка, Н. Чэмеравай).

## *Балады*

### Ішоў казак дарогаю…



Ішоў казак дарогаю,
Сустрэў дзеўку, звацць Галяю *.
- Ой ты, дзеўка, мая Галю,
Штось я табе сказаць маю.
Штось я табе сказаць маю,
Сем загадак загадаю.
Адгадаеш — мая будзеш,
Не 'дгадаеш — чужой будзеш.
Ой, што расце без карэння,
Ой, што цвіце без насення?
Ой, што гарыць без полам'я,
Ой, што бяжыць без повада?
Ой, што ўецца кругом дрэўца,
Ой, што сушыць каля сэрца?
Ой, што грае — голас мае?
— Казак дурань, што пытае.
Камень расце без карэння,
Доля цвіце без насення.
Сонца гарыць без полымя,
Вада бяжыць без повада.
Хмель уецца кругом дрэўца,
Любоў сушыць каля сэрца.
Скрыпка грае — голас мае,
Дзеўка Галя адгадае.

*Другі радок кожнай страфы паўтараецца два разы.

(Балады. Кн.1. Зап. Н. М. Маркава ў 1974 г. у в. Канатоп Нараўлянскага раёна Гомельскай вобл. ад хору даярак).

***

**Ой, на азярыне…**




Ой, на азярыне ды на сіненькай,
Вясна красна на увесь свет!
На кладачцы ды на гібенькай.
Зялён явар, зялёны!*
Там дзяўчына бель бяліла.
Бель бяліла, ручкі мыла.
Ручку мыла, персцень загубіла.
Дзе ўзылася шчука-рыба.
З хваль нырнула, персцень праглынула.
А к той азярыне ды на лугавіне
Ішло-брыло тры малойчыкі.
Тры малойчыкі-рыбалоўчыкі.
Йшлі на нерат, неслі невад.
Ой, мілыя мае тры малойчыкі.
Тры малойчыкі-рыбалоўчыкі.
Вы закіньце ў тоню невад.
Вы злавіце шчуку-рыбачку.
Адбярыце залаты персцень.
Я ж вам буду ў вялікай адгодзе:
Аднаму буду суседкаю,
Другому буду швагеркаю.
Трэцяму, згадаем, сама маладая.
Я да суседа агню знайду.
Я да швагра ў госці пайду.
А з каханым век жыць буду.
— Дзяўчыначка-журавіначка.
Загадаем табе сем загадак.
Адгадаеш — персцень атрымаеш.
Не адгадаеш — нас не дачакаеш.
А што шэпча без говара?
А што бяжыць без повада?
А што расце без кораня?
А што чорна не чэрнячы?
А што бела не белячы?
А што стогне без немачы?
А што ўецца наверх дрэва?
— Вецер шэпча без говара,
Вада бяжыць без повада,
Камень расце без кораня,
Снягі белы не белячы,
Воран чорны не чэрнячы,
Свіння стогне без немачы,
Хмель віецца паверх дрэва.

*Рэфрэн «Вясна красна на ўвесь свет!» і «Зялён явар, зялёны!» паўтараюцца па чарзе праз адзін радок.

(Балады. Кн.1. Зап. у 1957 г. у в. Зялёная дуброва Смалявіцкага раёна Мінскай вобл. ад пажылых жанчын. «Валачобная»).

## *Забаўлянкі*




Хадзіў бай па сцяне
У чырвоным жупане,
Нёс сямёра лапцёў:
І сабе, і жане,
І дзяцёнку па лапцёнку.
Ці бавіць, ці не?
-- Баў.

(Дзіцячы фальклор. Зап. у 1971 г. у в. Груздава Пастаўскага раёна Віцебскай вобл. ад М. М. Казлоўскай).

У апошніх двух куплетах парадак чаргавання секунды і тэрцыі адвольны. «Баў» не спяваецца, а гаворыцца.

***




Ішоў бай па сцяне,
Нёс сямёра лапцей:
І дзяцёнку па лапцёнку,
І жане, і сабе.
Ішоў бай па сцяне
У чырвоным каптане,
Нёс сямёра лапцей:
І дзяцёнку па лапцёнку,
І жане, і сабе.
А ці бавіць, ці не?

(Дзіцячы фальклор. Зап. 1971 г. у в. Груздава Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці).
Напеў калыханкавага складу. Вельмі каларытна і напоўнена гучыць у другой палавіне напеву пентатанічны абарот ад тэрцыі да ніжняй квінты ладу.

***Лічылкі***

Энікі-бэнікі,
Елі варэнікі.
Энікі-бэнікі.
Клёц!

(Дзіцячы фальклор. Зап. Г. А. Барташэвіч у 1970 г. у в. Міхалішкі Астравецкага раёна Гродзенскай вобл. ад дзяцей).

***

Сем семярэй
І сямёра свіней.
Свінка і свінячын брат
І сямёра парасят.

(Дзіцячы фальклор. Зап. Р. В. Шматава ў 1949 г. у в. Казулічы Кіраўскага раёна ад Насці Драгун, 16 г.).

***

Ішла кошка па раялі,
Наступіла на педалі,
Заспявала:
- До, рэ, мі, фа,
соль, соль, ля, сі,
Што украла – прынясі.
- Я украла кілбасу,
Заўтра рана прынясу.

(Дзіцячы фальклор. Зап. Н. М. Маркава ў 1971 г. у в. Мядзведзічы Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобл. ад Ані Цярпіцкай, 12 г.).

Заданне.

Падлічыце, колькі нотаў ведала кошка.

***Казкі***

**Як селянін зрабіўся памочнікам цара**

Аднойчы рубіў мужык ля дарогі дровы. Была зіма, а ў яго не было рукавіцаў. Рукі мёрзлі, але трэба было зарабіць на хлеб. Па дарозе міма ехаў цар, які ўбачыў, што чалавек у мароз голымі рукамі сячэ дровы. Цар сказаў астанавіць коні і падышоў да чалавека.

— Ці ж тыя пяць не могуць гэтым семяром адпачыць даць? — запытаў цар.

Чалавек спачатку разгубіўся, а потым сцяміў, што цар гэтым хацеў сказаць, і адказаў:

— Маглі б тыя пяць даць адпачынак семяром, але трыццаць два не дазваляюць.

Цар задумаўся над адказам мужыка, нічога не кажучы, паехаў у свой палац.

У палацы цар доўга думаў, што азначае адказ чалавека, але нічога не выдумаў і загадаў прывясці таго чалавека да сябе.

Той, перапужаўся, стаяў перад царом, які запытаўся, што азначае яго адказ і ці зразумеў ён яго пытанне.

Чалавек адказаў:

— Тваё пытанне зразумеў так: пяць — ёсць летнія месяцы, а сямёра — зімнія. Але ўлетку няма сілы таго зрабіць, што за зіму з'ясі — таму я і казаў, што трыццаць два не дазваляюць, бо чалавек мае 32 зубы.

— Так, — цар адказаў, — бачу, што ты разумны, і таму не будзеш болей дроў сячы, а будзеш маім памочнікам.

(Народная педагогіка… С. 121).

***

## Як мужык хітра гусь падзяліў

Адзін бедны мужык прынёс да пана гусь і просіць, каб пан даў за яе шуфель жыта. Так пан кажа:

— Ну, нас ёсць сямёра: я, пані, двох сыноў і дзвёх дочак, падзялі ж ты на нас гэту гусь.

Той падумаў: "Добра".

— Пан, — кажа, — галава ў дому, то пану будзе ґалава; пані будзе шыйка, бо першая па пану; паненкам будзе па ножцы, каб летка танцавалі, панічом па скрыдэлку, каб пекна пісалі, а я, — кажа, — мужычышча, вазьму кадлубішча.

— Ну, — кажа пан, — хітры тыі

Гусь яму аддаў і ўжо не адзін шуфель, але, можа, якіх даў з пяць. Ён прынёс жыта, а брат, як даведаўся, так узяў дзве ґусі, занёс да пана і просіць таксама жыта. Пан кажа:

— Добра, але падзялі ж ты нас.

Той падумаў і кажа:

— Пану будзе гусь і пані будзе гусь.

— А маім дзецям?

Так той і не ведае, што рабіць.

— Ідзі ж, — кажа пан, — па свайго брата, ён нас падзеліць.

Пайшоў ён па таго, прыходзіць, так пан кажа:

— Падзялі ты нас, бо твой брат дурны якісь, не дасць рады.

Той падумаў трошкі і кажа:

— Ці пан верыць у святую Тройцу?

— Цо табе гэто, альбо я не католік?!

— Ну, калі так, то пан, пані і галоўка — то святая Тройца, дзвёх паненак і ножка — то і святая Тройца, двох панічоў і скрыдэлка — то і будзе святая Тройца, а мужык і дзве ґусі — то таксама святая Тройца.

Так пан аддаў яму гусі і жыта, колькі ён хацеў, а брата прагнаў прэч. От якісьці быў мудрагель.

(Народная педагогіка…С. 121-122)

# Лік 8

### *Прыказкі і прымаўкі*

Восень – на дзень пагод восем.

Восень – работ восем.

Прыйшла вясна – ужо часу няма; прыйшло лета – бярыся то за тое, то за гэта; надыйшла восень – яшчэ работ восем.

Хавай асьмачок на ліхі дзянёк.

### *Загадкі*

Восем васьмей, пяць па пяцей, дзве во якіх ды дзве во якіх – моцька ды роцька. (Сані, вязы, аглоблі, палазы, падсядзёлак, хамут).

На дрэва лезе на васьмі нагах, а з дрэва на трох. (Павук).

### *Загадкі-задачы*

Муж з жонкай населі буракі ў пограб, а маленькі Сымонка забаўляўся каля іх:

— Што ж ты, Сымонка, маме не дапамагаеш? — жартуючы сказаў бацька. — Бачыш, як яна стамілася.

Дзщя схапілася, набрала ў падолак буракоў ды і нясе.

— Ну, колькі ж ты, Сымонка, прынёс? — пытае бацька.

— Дваццаць,— адказаў Сымонка.

Глянуў бацька ў падолак, усміхнуўся і сказаў:

-- Не, сынку! Як бы ты ўзяў столькі, ды паўстолькі, ды чвэрць таго, ды я табе даў два буракі, ды мама два, ды ты сам яшчэ выкапаў два, тады было б дваццаць.

Колькі было буракоў у Сымонкі?

(Восем).

### *Лічылкі*

Анцы, цванцы,
Трычы, рычы,
Эны, бэны,
Мэны, вэк!

(Дзіцячы фальклор. З запісаў І. У. Саламевіча ў в. Малая Кракотка Слонімскага раёна Гродзенскай вобл.).

Заданне.

Падлічыце, да якога ліку дзеці выдумалі лічылку.

***

Раз, два, тры, чатыры,
Пяць, шэсць, сем, восем,
Выйшла бабка з доўгім носам,
А за бабкай сівы дзед,
Запытаець, колькі лет.

(Дзіцячы фальклор. З рукапіса С. П. Сахарава 1944 г.; Народная творчасць Латгальскіх і Ілукстэнскіх беларусаў).

***

Раз, два, тры, чатыры,
Пяць, шэсць, сем, восем,
Мы цябе, стукач, папросім.

(Дзіцячы фальклор. Зап. Л. М. Салавей у 1969 г. у в. Беражное Столлінскага раёна Брэсцкай вобл.).

# Лік 9

***Прыказкі і прымаўкі***

Не хапае дзевяць грывен да рубля.

### *Загадкі*

Ішла Марушка ў дзевяці кажушках, і хто на яе гляне, той заплача. (Цыбуля).

### *Балады*

**Пасціла дзеўка стада коней…**




Пасціла дзеўка стада коней,
Цёплае сонца й усходзіць! *
Папасціўшы, моцна заснула,
Моцна заснула, коней не пачула,
Прачнулася — коні зніклі.
Стала дзеўка думаць-гадаць,
Куды ісці коней шукаць.
Пайшла б лесам, дык баюся,
Пайшла б лугам — намачуся.
Пайшла дзеўка дарогаю,
Дарогаю шырокаю,
Сустракае трох казачэнькаў.
- А вы, казачэнькі, а вы, маладзенькі,
Ці не бачылі стада коней?
Адзін кажа: я й не бачыў,
Другі кажа: то ж не бачыў,
Трэці кажа: я й сам там быў,
Я й сам там быў, коней бачыў.
Загадаем дзеўцы дзевяць загадак,
Калі адгадаеш, дзе коні скажам.
А што ж бяжыць без повада?
А што расце без кораня?
А што гарыць без полымя?
А што расце вышай лесу?
А што цвіце— ніхто не бачыць?
А хто плача без голаса?
А хто ж белы ды не белючы?
А хто чорны ды не чэрнючы?
А хто рабы ды не раблючы?
- Багдай жа я ды не бацькава,
Ды не бацькава, ды не матчына,
Каб я гэта не адгадала.
Вада бяжыць без повада,
Камень расце ды без кораня,
Сажа гарыць без полымя,
А хмель расце вышай лесу,
ПапарацЬ цвіце — ніхто не бачыць,
Конік плача без голасу,
Лебедзь белы не белючы,
Воран чорны ды не чэрнючы,
Дзяцел рабы ды не раблючы.
- Тваe коні ў чыстым полі,
Ядуць траву пшанічную,
А п'юць ваду крынічную,
Ядуць траву яравую,
А п'юць ваду сцюдзёную.

*Рэфрэн «Цёплае сонца й усходзіць!» паўтараецца пасля кожнага радка.

(Зап. Л. М. Салавей у 1974 г. у в. В. Хальнявічы Крупскага раёна Мінскай вобл. ад Надзеі Красняковай, 1901 г.н. «У Вялікі пост»).

### *Замовы*

### Супраць спуду

І ні раз, і ні два, і ні тры, і ні чатыры, і ні пяць, і ні шэсць, і ні сем, і ні восем, і ні дзевяць, угаварай, маўляй – кашэчая, заечая, сабачая, гусіная, курыная, тхарыная, свінячая выходзь з касці, з маршчы, з румянага (чыйгосьці) цела.

(Гомельская вобласць. Зап. у 1983 г. у в. Вясельская Калінкавіцкага раёна ад Казак Л., 1933 г.н.).

***

### Падвей

Ехаў Падвей на дзевяцёх каней, а з дзевяцёх на васьмёх, а з васьмёх на сямёх, а з сямёх на шасцёх, а з шасцёх на пяцёх, а з пяцёх на чатырох, а з чатырох на трох, а з трох на двух, а з двух ды на адным, ды ўпаў і прапаў.

Дзе людзі не ходзяць, дзе пеўня голас не чуваць, дзе месяца не відаць, дзе сонейка не свеціць, дзе хлопец сякерай не рубае, дзе дзеўка касой не махае, там табе і напіцца, і нагуляцца. Ад белатварага, нараджонага, хрышчонага *(імя…)*, адчапіся!

(Зап. А. Лозка ў 1979 г. у в. Глушкавічы Лельчыцкага раёна ад невідушчай Сербянок Марты Паўлаўны, 1904 г. н. Падвей – хвароба на целе дзіцяці ў выглядзе чырвоных прышчоў, якія ўзнікалі ад подыху дрэннага ветру, па тлумачэнню інфарматара).

***

### Волас

Госпадзі Божа, прыступі, дапамогу прынясі колас шаптаць і волас выліваць. І не адзін, і не два, і не тры, і не чатыры, і не пяць, і не шэсць, і не сем, і не восем, і не дзевяць.

- Месяц-ясеньчыку, ты не быў на тым свеце?
- Быў.
- Ці баляць у мёртвых зубы?
- Не.
- То няхай не баляць і мне.

(Зап. Лозка А. у 1984 г. у в. Прыбалавічы Лельчыцкага раёна ад Гаўрылавец Саламоні Агееўны, 69 г. Шэпчуць, каб суняць боль зубоў. Бяруць дзевяць каласкоў жыта, складаюць па тры ў кожны пучок. Прыкладаюць яго да шчакі насупраць хворага зуба і, шэпчучы, льюць павольна цёплую ваду на каласкі..

***

### Кроў, удар

Госпаду Богу памалюся, Прачыстай Божай Маці пакланюся. Прачыста Божа Маці, прыступі, дапаможы *(імя…)* кроў *(удар)* шаптаці.

Першым разочкам, лепшым часочкам. Ішло тры калекі цераз тры рэкі, адну мядовую, другую вадзяную, трэцюю крывяную. Мядовую вып'ем, вадзяную выльем, крывяную замовім.

Другім разочкам, лепшым часочкам… *(Дзевяць раз).*

(Зап. Лозка А. у 1979 г. у в. Дзяржынск Лельчыцкага раёна ад Баланчук Домны Карпаўны, 70 г.).

### *Лічылкі*

Ходзе бусел па балоту,
Кліча жабаў на работу.
Дзевяць.

(Дзіцячы фальклор. Са зборніка Е. Раманава «Белорусский сборник». Вып. II. Кіеў, 1886).

Заданне.

Адкажыце, чаму лічылка заканчваецца на слова "дзевяць".

### *Гульні*

#### Маша

Усе становяцца у круг, пасярэдзіне Маша з завязанымі вачыма. Усе прыгаварваюць:

Маша, ты пацеша наша,
Ручкі злажы, на імя* ўкажы.

Маша хапае каго-небудзь з круга і павінна адгадаць, хто гэта. Калі адгадае, той становіцца Машай. Гульня паўтараецца.

(Дзіцячы фальклор. Зап. Г. А. Барташэвіч у 1970 г. у в. Міхалішкі Астравецкага раёна Гродзенскай вобл. ад дзяцей).

Заданне.

*Замест «імя» называйце лік, папярэдне прысвоіўшы кожнаму гульцу.

### *Казкі*

#### Як чалавек збавіўся

Адзін чалавек вельмі гараваў. Не вытрымаўшы цяжкасцей гаворыць:

— Я ўжо запрадаў бы душу, каб палепшала. Тут і з явіўся бес і кажа:

— Падпішыся.

Ён і падпісаў ліст, але Бога не выракся. А бес сказаў яму, што пр дзевяць год прыйдзе, каб начавау адзан. А к таму чалавек пры: .шоу. Прыходзщь готы і пытаецца, чаму удвох. А чалавек адказва

— Удвох — рада і парада,
утрох — зрада,
учатырох добра хату рубіць,
упяцёх добра малаціць,
ушасцёх -- пасеку разрабляць,
усемярох -- касіць,
увасьмярох -- лес рубіць.

— *А* дзевяць?

— Дзевяць год пражыў, дзевяць парсюкоў з еў, прав людскую ласку, а не праз тваю казку. Выйдзі адсюль!

Бес і знік. Так чалавек і ўратаваўся.

(Казкі ў сучасных запісах. Зап. Г. А. Барташэвіч у 1975 г. у в. Клінок Чэрвеньскага раёна ад М. Я. Коўтун).

### *Святы і прысвяткі*

**Дзевятнік** – чацвер на дзевятым тыдні пасля Вялікадня. Не працавалі ў полі, засцерагаліся грому. Ва ўсходнім Палессі прыкмячаюць: «Трэ коб на Дзевятнік було дзеўяць ягодзін на ветцы» (Тураўскі сл., 1982). Збіраючы ягады, грыбы і арэхі, спявалі песні. З гэтым днем звязваюць рост жыта ў валачобных песнях: Дзевятнік «красу здымаець», «краску кладзець», «красуець», «у пукі бярэць».

Дзевятнік – народная назва свята. Яна ўзнікла ў канцы XIX стагодзя ў гонар пераводу беларускіх уніятаў пад лона праваслаўнай царквы. Католікі і уніяты адзначалі яго як свята Цела Божага. Святар Іван Берман (1873) сведчыў, што «Тутэйшая заходнеруская царква праводзіць у гэты дзень хросны ход, ставяць бярозкі для упрыгожвання царквы, а прыхаджане прыносяць з сабою на малебен зелле, гэта значыць кветкі, вянкі з траў, якія захоўваюць да Іванавага дню» (Ашмянскі павет).

***

**Дзевятуха** – пятніца на дзвятым тыдні пасля Вялікадня.У Добрушскім раёне лічаць, што Дзевятуха, як і Дзесятуха, гэта свята ад навальніцы, а ў Лельчыцкім кажуць: «Дзевятуха – то польскае сьвято, а Дзесятуха – нашое». У валачобных песнях побач з Дзесятнікам яна з'яўляецца адным з этапаў росту жыта:

Дзевятушка-памяжаначка
Па межах хадзіла, жытцо абзірала,
Жытцо абзірала да й раўнавала...

Іншы раз святы не размяжоўваліся.

## Лік **10**

### *Прыказкі і прымаўкі*

Адзін біты дзесяцёх нябітых каштуе.
Адзін сыцее – дзесяць пацее.
Галава адна, а языкоў дзесяць.
Дзесяць раз мер і то не вер.
Дзесяць раз мерыць і то сам сабе не верыць.
Прадаць – адны лапці стаптаць, купіць – трэба дзесяць знасіць.
Не хваліся ў год, а хваліся ў дзесяць.
Сарока з куста, а дзесяць на куст.
Свае дзесяць разоў пасварацца і паміракца.
Сем сёл, адзін вол, дзесяць начальнікаў.
Сем сёл, адзін вол, а дзесяць прыганятых.

### *Фраземы*

Дзеля адной ежкі сем міль пешкі = За лыжку яды сем вёрстаў хады = Сем міль еду дзеля аднаго абеду = За хунт ляпешкі дзесяць вёрстаў пешкі – За семь вёрст киселя хлебать.

### *Загадкі*

Адзін на лаўцы, а дзесяць пад лаўкай. (Пальцы на нагах у час сядзення на лаўцы).

Дзесяць братоў ёсць: пяць мокрых пад стогам, пяць сухіх каля стогу. (Пальцы ў час прадзення).

Дзесяць пальцаў, а ногцяў няма. (Пальчаткі).

Кожны мае з вас, рабяткі, верных сяброў па дзесятку, яны кормяць, апранаюць, працаваць дапамагаюць. (Пальцы).

У мацеры дзесяць сыноў: пяць у дарозе. А пяць дома. (Пальцы ў час прадзення).

Шэсць вок, дзесяць ног. Тры галавы ў адзін бок. (Араты з плугам і пара коней).

### *Загадкі-задачы*

Несла гаспадыня ў кошыку дзесяць яец, а дно ўпала. Колькі засталося?
(Нічога, усе разбіліся). Капаткевіцкі р..

### *Лічылкі*

Энікі-бэнікі,
Елі варэнікі.
Энікі-бэнік,
Клёш,
Выйдзі,
Пузаты матрос.

(Дзіцячы фальклор. Зап. Е. С. Шырвель у 1971 г. у в. Проўжалы Валожынскага раёна Мінскай вобл.).

---

***

Раз, два — кружава,
Тры, чатыры — пачапілі,
Пяць, шэсць— кашу есць,
Сем, восем — сена косім,
Дзевяць, дзесяць —
грошы весіць.
Грош згубілі, два знайшлі—
У карчму пайшлі:
Чай п'юць, кружкі б'юць,
На стол грошыкі кладуць.

(Дзіцячы фальклор. Зап. Г.Нікіфароўская ў 1924 г. у Вецслабадзе Лудзенскага павету ад бабкі Домны).

***

Раз, два — булава,
Тры, чатыры — прычапілі,
Пяць, шэсць — кашу есць,
Сем, восем — сена косім,
Дзевяць, дзесяць — сена весць.

(Дзіцячы фальклор. Зап. Г. Ф. Юрчанка ў 1971 г. у в. Кудрычы Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобл. ад маці, Васілісы Міхайлаўны).

## *Жарты*

### Папова рэшта

Адна жанчына часта хадзіла ў храм боскі. Аднойчы яна зайшла да суседкі:
- Пазыч мне рубель на царкву.
Тая дастала з куфра 10 рублёў.
- На, -- кажа, -- гэтыя, бо другіх няма.
Жанчына ўзяла грошы і пайшла. Назаўтра прыносіць суседцы адзін рубель. А тая:
- Я ж табе давала дзесяць!
- А хіба ты не ведаеш, -- гаворыць жанчына, -- што поп рэшты не дае?

(Жарты… № 713. Зап. В. Фаменка).

## *Казкі*

Едуць пан з кучарам. Пан і гаворыць:
— Во, убіў я зайца, дык з яго сала было з цэлы пуд. А кучар яму:
— Во, пане, будзем ехаць праз мост, дык там чорт брахуноў хапае.
— А далёка той мост?
— Ды не,— кажа кучар,— во за гэтым лесам, дзе горка, а там луг, а там ужо зусім блізка.
Як уехалі яны ў лес, пан зноў кучару:
— Каб ты бачыў таго зайца! Аднаго сала яго было фунтаў з дзесяць.
Едуць яны далей, праехалі ўжо лес, так пан:
— Ну, можа, не дзесяць, але ж фунтау пяць з таго зайца сала было.
А як пайшла дарога лугам, дык пан ужо:
— Ну, хоць сала на ім не было, а ўсё ж заяц быў і не такі худы.
Едуць яны далей. Праехалі луг, грэблю, а маста ўсё няма.
— А дзе ж той мост? — пытае пан.
— А разышоўся, як заечае сала.

(Беларускія народныя казкі. Зап. К. П. Кабашнікаў у 1956 г. у в. Баравое Лельчыцкага раёна Гомельскай вобл. ад Я. Шомкі).

## *Святы і прысвяткі*

**Дзесятнік** – чацвер на дзесятым тыдні ад Вялікадня, адзін з этапаў даспявання жыта («Дзесятнік гнаі возіць, Дзесятуха косы точыць»).

***

**Дзесятка** (Дзесятуха, Дзесятуха Мучаніца) – пятніца на дзесятым тыдні пасля Вялікадня; адзін з этапаў даспявання жыта ( «Дзесятка – жыту пятка», «Дзесятуха зярно поўніць», «Дзесятуха жыта паспявае» -- з валачобных песень). Засцерагаліся маланкі і грому, не працавалі.

«Аброчны» дзень абаронцы свойскай жывёлы. «Абракаліся людзі, шоб худоба не гінула». На Усходнім Палессі праводзілі абрады ля «святых» крыніц, асвячалі з папом ваду ля вадаёмаў з абразам Параскевы.

# Лікі ад 11 да 20

### *Прыказкі і прымаўкі*

Ад Каляд тры разы пяць, пастушкі ў поле ляцяць.
Грамніца – хлеба палавіца, зімы трэцяя частка.
Калі да дваццаці работу рабіць не навучышся, то да сівой барады намучышся.
Пашануй адзежыну, яна цябе дваццаць раз.

### *Загадкі*

Дуб-дубавік, 12 галінак, на кожнай галіне па чатыры гняздзіны, у кожнай гняздзіне па 7 птушанят, кожнае мае сваё імя. Хто адгадае, што за сям'я? (Год, месяц, тыдзень, дзень).

На ганх, на ганах, на чатырнаццаці нагах, шалусіны-балусіны з-пад белага мястэчка. (Вадзяны млын).

### *Загадкі-задачы*

Купец купіў за дваццаць грошай дваццаць яек: качыныя — па тры грошы, гусіныя — па два грошы, а курыныя — па паўгроша. Колькі было куплена качыных, гусіных і курыных яец?

(Качынае — 1, гусіных — 5, курыных — 14). Слонімскі павет.

***

Янук, Пятрок і Сцёпка забаўляліся ў арэхі, усё складалі іх на кучкі і лічылі. А наймудрэйшы з іх быў Пятрок. Вось ён і кажа:

- Глядзіце, мальцы! Як я злажу свае арэхі з Януковымі, а адбяру адтуль столькі, колькі мае Сцёпка, то застанецца дваццаць арэхаў. Праўда?
- Праўда.
- А як я злажу свае арэхі са Сцёпкавымі ды адбяру столькі, колькі мае Янка, то ўжо застанецца толькі дзесяць арэхаў. Так?
- Так.
- А як вы разам зложыце, а я адбяру столькі, колькі маю сам, то ўжо нічога не застанецца. Праўда?
- Праўда.
- Колькі ж арэхаў меў кожны хлопец?

(Янук — 10, Пятрок — 15, Сцёпка — 5).

***

З дзевяці паперак дваццаць рублёў?

(Адна – 10 руб., адна – 3 руб. і сем – па 1 руб.). Слонімскі павет.

***

Раздзяліць дваццаць рублёў, каб выйшла дзевяць паперак.

(1 – 10 руб, 7 – па 1 руб. і 1 – 3 руб.). Старобінскі р.

***

Дваццаць без пятнаццаці, трох не далажыўшы, двух не далічыўшы. Колькі будзе? (Нічога).

***

На дрэве сядзела адзінаццаць курапатак. Паляўнічы ў адну птушку пацэліў з першага стрэлу. Колькі курапатак засталося на дрэве? (Нікольки).

*Жарты*

**Арыфметыка**

- Ці багата, бабка, ваша кароўка малака дае?
- Дзесяць літраў.
- А колькі прадаваць носіце?
- Пятнаццаць.

(Гомельская вобласць. Зап. Скідан у 1964 г. у в. Высокае Хойніцкага раёна ад Ганчарэнкі Г.).

***

**Мужыцкая загадка каралю**

Аднаго разу чалавек вёз фуру дроў, напаткаў яго кароль і пытае.

- Куды вязеш?
- Вязу прадаваць.
- А што ты за іх возьмеш?
- Дваццаць грош.
- Што ты з іх зробіш?
- Пяць аддам, пяць пазычу, пяцьма жонку жыўлю, пяць у воду пушчу.

І раз'ехаліся. Кароль задумаўся, што гэта за загадка. Паклікаў сваіх падданых, але яе ніхто не разгадаў. Тады выклікаў таго самага чалавека, і той яму растлумачыў:

- Пяць на радзіны, пяць на дзяцей, пяць для сябе і для жонкі, а пяць на падатак.

(Жарты… Зап. М.Федароўскі ў в. Ходараўка Сакольскага павету Гродзенскай губ. ад А. Дзежкі).

***

**Колькі ўсіх**

- Ведаеш, Янка, ажэнімся, але адначасна з табою!
- Згода, добра! Але й штука будзе!
- Ну, якая ж тут штука?
- Чаму ж не штука, калі 12 асоб пачнуць гаварыць адно аднаму «ты».
- Як жа гэта ў цябе выходзіць?
- Вельмі проста: ты і твая жонка – дваіх; я і мая жонка – чацвярых; твая жонка і я – шэсць; мая жонка і ты – восем; нашыя дзве жонкі – дзесяць; ну і мы абодна – вось табе і дванаццаць!

(Жарты…№ 590).

***

Адно васемнаццаць, а другое без двух дваццаць.

Заданні.

Адкажыце, у чым заключаецца жарт і сэнс у гэтых творах.

### *Дражнілкі*

Віця, Віця, Віцяля,
З'еў карову і цяля,
А тады яшчэ падрад
З'еў дванаццаць парасят.

(Мінская вобласць. Зап. у 1979 г. у в. Швабы Лагойскага раёна ад Яцкевіч Ш., 1967 г.н.).

### *Лічылкі*

Эны-бэны, фіны, лёк,
Сам Пятровіч бліны пёк.
Пёк, пёк не дапёк,
Схапіў шапку ды й уцёк.

(Дзіцячы фальклор. Зап. Г. А. Барташэвіч у 1970 г. у в. Міхалішкі Астравецкага раёна Гродзенскай вобл. ад дзяцей.).

Заданне.

Падлічыце, на якім па ліку гульцу скончыцца лічылка.

### *Песні*

**А у печы жар, жар…**




А у печы жар, жар,
На прыпечку дзіва:
Наварыў верабей
Пшанічнага піва.

А для дарагіх гасцей
Мурашку зарэзаў,
Кадку мяса насаліў,
Шост кілбас навесіў.

Чалом, чалом, верабей,
Лятуць к табе госці,
Ляці скарэй пераймаць
Важных ягамосцяў.

Ляціць доўгі журавель,
За ім чапля і хрушчэль.
І пані странатка,
Яна яму матка.

І пані чачотка,
Яна яму цётка,
Сіняя сінічка –
Родная сястрычка.

Прыляцелі совы,
Селі пазастоллю;
Прыляцелі каўкі,
Паселі на лаўкі.

А варона хлябок кроіць,
А муха місачкі строіць,
Камар піва носіць,
Піці-есці просіць.

Елі кашу са швядамі,
Елі й верашчаку.
Як пад' елі, напіліся,
Усе сказалі: «Дзякуй!»

Крук варону стук у бок,
Сойка сойку за чубок.
Завяліся біцца,
Не маглі змірыцца.

А хрушчэль упіўся,
Пад стол заваліўся.
А сарока пайшла ў скокі
Узяўшыся ў бокі.

На вяселлі вераб'я
Весяліліся два дня.
Я таксама там быў,
Салодзенькі мёд піў.

(Дзіцячы фальклор. Зап. у Лепельскім павеце ад М. Сталыгва).

Першая частка напеву ў тыповым для дзіцячых заклінальных прыпевак складзе. Трыхордавы меладычны абарот, на якім будуецца гэта частка, сустракаецца ў дзіцячай творчасці многіх народаў…

Заданне.

Падлічыце колькі гасцей было ў вераб'я. (13). Падлічыце таксама колькі прысутнічала відаў птушак на вяселлі з наступнай жартоўнай песні. (22).

***

**Шчыглік невялікі…**

Шчыглік невялікі
Грамаду збірае,
Сам не хоча адзін жыць,
Жаніціся мае.

Узяў сабе пціцу –
Бараву сініцу,
Красную, ясную,
Вераб'я сястрыцу.

Паслаў арла, паслаў арла
Усё птаства збіраці,
А арол напаў на гусі,
Давай мардаваці.

Два снегіры, два снегіры
Шпака спаймалі,
А вароны за той час
Каравай згібалі.

Два каплуны, два каплуны
Солад малацілі,
Курапатка і з цяцерай
Да млына насілі.

Бацян меле, бацян меле,
А крук засыпае,
А варобчык, добры хлопчык,
Муку абірае.

Перапёлка, перапёлка
Хату замятае,
Сава сядзіць на покуце,
Скоса пaглядае.

Сядзіць дзяркач на парозе,
Сядзіць на парозе,
Пугач, пугач ушіўшыся
Ляжыць на марозе.

А сарокі, як прыданкі,
Скачуць каля лаўкі
— Бедна наша галованька,
Не маем прыганкі.

А чаечка з кулічком
На вяселлі грае.
А кулік чайку
Узяў за чубайку.

Чайка кігіча:
— Згінь ты, куліча!
А зязюля-вазніца,
Харошая пціца,

Залатыя крылы мае,
Так гучна лятае.
А чмель мёду дадае
І госцей прымае.

(Дзіцячы фальклор. З рукапіса Яна Чачота «Песенькі з-пад Нёмана і Дзвіны», сабраныя ў 1836—1839 гг.).

**Як паставіў верабейка…**







Як паставіў верабейка
На сметнічку хату
Ды сазваў на наваселле
Госцейкаў багата.

Піва, квасу наварыў,
Квашанінкі настудзіў,
Насмажыў кілбасаў
І ўсякага мяса.

У залачонай карэце
Дзяцел пад' язджае,
А за дзятлам на валах
Жоўна паспяшае.

А зязюля з шуляком,
Перапёліца з круком
Лугам, даліною
Шпарaць пехатою.

Заклікае верабейка
Усіх госцейкаў есці,
Запрашае белу лебедзь
На покуце сесці.

А з лебеддзю — жураўля,
І савішчу, і луня,
І стару чачотку,
Сваю родну цётку.

Сядзіць мядзведзь на калодзе,
На скрыпачцы йграіць,
Дзщяняты-медзвядзяты
Струны напраўляюць;

Як зайгралі «дылы-дылы»,
Госці ў далоні білі, --
А адзін дзівavaўся,
А другі смяяўся.

За здароўе вераб'я
Пілі, елі аж да дня,
А бацян упіўся
Ды пад стол зваліўся.

(Дзіцячы фальклор. Зап. у 1946 г. у в. Крывічы Старобінскага раёна).

Напеў шырокага меладычнага развіцця: адразу ж ахопліваецца дыяпазон актавы. Структура двухчасткавая; кантраст паміж часткамі агульнаінтанацыйны: у 1-й частцы меладычнае развіццё ідзе ўніз, у 2-й – уверх.

Заданне.

Падлічыце колькі гасцей было ў верабейкі на наваселлі. (16).

***

***Гульні***

**Нумары**

Гэтая гульня праводзілася на вячорках. Удзельнічалі хлопцы і дзяўчаты. Усім тайна даюцца нумары: хлопцам – цотныя, дзяўчатам – няцотныя. Усе сядаюць кругам. Нехта адзін, хлопец ці дзяўчына, пачынае:

- Каму жыць, каму жыць, каму нажывацца. Сяду на калені, буду цалавацца.

Калі гэта хлопец, то адпаведна называе нумар нейкай дзяўчыны. Дзяўчына выбягае, і тады яны цалуюцца.

(Гульні, забавы, ігрышчы. Зап. у в. Славені Шклоўскага раёна Магілёўскай вобл. ад Н.Ц.Прохаравай, 1915 г.н.).

# Лікі больш 20

### *Прыказкі і прымаўкі*

Купі чорта за руб, тады і за паўтараста не аддасі.
На Саракі ў адзін дзень сорак марозаў.
На Саракі вылятае сорак выраяў.
Хавай палцінку на злую гадзінку.

### *Фраземы*

Як на сто коней сеў = На неба ўзлесці = Рай адамкнуўся (адчыніўся) – На седьмом небе.

### *Загадкі*

Анціп нізак, на ім сто рызак. (Качан).
Бегла ваўкоў дваццаць пяць, ды і цяпер сляды знаць. (Барана).
Выходзілі дванаццаць малайцоў, выносілі пяцьдзесят два сокалы, выпускалі трыста шэсцьдзесят пяць лебядзей. (Год, месяц, тыдні, дні).
Дванаццаць арлоў, пяцьдзесят дзве галкі знялі адно яйцо. (Год).
Дваццаць два чалавекі забіць мяне хочуць; як заб'юць, адзінаццаць радуюцца, адзінаццаць сумуюць, а я жывы застаюся. (Футбольны мяч).
Ем я вугаль, п'ю ваду, цягнц абоз на сто калёс. (Паравоз).
Імчыцца абоз на сто калёс. (Цягнік).
Імчыць конь, вочы – агонь, сто вазоў прэ, народ вязе. (Цягнік).
Ішла пані з маста, на ёй кашуль за ста. (Качан капусты).
Гарбулька гарбата, на сілу багата; таго сто коней не павязе, што гарбулька на гарбе панясе. (Цягнік, рака).
Грымнуў вол на сто рэчак, на сто печак, на сто каміноў (Пярун, гром).
Два нюхаюць, два слухаюць, чатыры плешчуць, а семсот свішчуць. (Конь).
Два стаяць, два свецяць, чатыры плешчуць, адзін раве, аднаго нясуць, семсот свішчуць. (Конь).
Дваста бадаста, чатырыста хадаста, два ўхтары, адзін махтар. (Карова).
Дваццаць пяць у дрэве сядзяць. Хлеб горнуць. А хлеба не ядуць. (Барана).
900 муляроў зрабілі хату на сто вуглоў. (Мурашкі).
Ішло хлопцаў дваццаць пяць, пасля зімы сляды знаць. (Барана).
Крутаста, вяртаста, на ёй кашуль за ста. (Капуста).
Крутаста, вяртаста, на ёй сукон за ста, хто адгадае, той пажыве год за ста. (Качан капусты).
Малы-малы малышачкі носяць воду пад вышачкі. (Пчолы).
Пад адным каўпачком семсот казачкоў, пасярэдзіне струп. (Мак).
Пяцьсот свішча, трыста плешча, два слухаюць, два нюхаюць. (Конь).
Раз стукне – сто слядоў аставіць. (Пастол).
Па полі ідуць – сто слядочкаў астаўляюць. (Лапці).
Рыкнуў вол на сто гор, на сто рэчак, на сто печак, на сто дваццаць сажаняў. (Пярун, гром).
Рассыпаўся гарох на семдзесят дарог, ніхто не падбярэ: ні цар, ні царыца, ні красная дзявіца. (Град).

Семсот муляроў збудавалі дом без вуглоў. (Пчолы).

Семсот сарочак, семсот спаднічак, выйшла надвор, а затылак гол. (Курыца).

Семсот сарочак, семсот намётак, а дуне вецер, адкрывае іх да голага цела, хоць адзёжа на мне і ўся цэла. (Курыца).

Сем тысяч майстроў зрабілі хату без вокан і без вуглоў. (Мурашкі, мурашнік).

Стаіць дуб у чыстым полі, а на ім дванаццаць голляў, а на голлях,як заўсёды, пяцьдзесят і два гнязды. Па сем яек там ляжыць. Што гэта за дуб там стаіць? (Год).

Стаіць дзядок нізак, на ім сто рызак. (Качан).

Стаіць паненка, на ёй белая сукенка і яшчэ шэсцьдзесят адзёжак ды ўсе без засцёжак. (Капуста).

Сто мільёнаў гарбароў зробяць хату без вуглоў. (Мурашкі).

Сто сястрыц адну хустку вяжуць. (пчолы і соты).

700 свішча, чатыры танцуе, дзве свечкі гараць, два вартавыя стаяць. (Конь).

Сто адзін брат, усе ў адзі рад, разам звязаны стаяць. (Пляцень).

Стаіць палка, на той палцы – галка, а ў той галкі – семсот галчанят. (Макаўка).

Сям'я – душ трыста. І багата, ды ўсяго два локці хата. (Муравейнік, вулей).

Тысячы брацікаў звязаны, адным поясам падпяразаны. (Сноп).

У адным доме сотні жыхароў, а сям'я адна. (Вулей).

Ходзіць пан па горадзе, носіць бліны на барадзе, кусок мяса на галаве. (Певень).

Чатыры ладкі плешчуць, дзве зорачкі гараць, дзве свечачкі стаяць і тысяча свішчуць. (Конь).

***Загадкі-задачы***

Чатыры гіры весяць сорак фунтаў. Якога весу павінна быць кожная з іх, каб можна было імі зважыць любую колькасць ад сарака фунтаў.

(Першая гіра — 1 фунт, другая — 3 фунты, трэцяя — 9 фунтаў, чацвёртая — **27** фунтаў). Капаткевіцкі р.

***

Ляцеў статак гусей. Насустрач яму адна гусь:

- Добры дзень, сто гусей!

- Нас не сто гусей. Каб нас было яшчэ столькі, паўстолькі, чвэрць столькі і ты, адна гусь, тады было б сто гусей. Колькі ляцела гусей?

(Трыццаць шэсць гусей). Капаткевіцкі р.

***

Ляцела сарока, а за ёю сорак. Колькі ляцела?

(Двое). Слуцкі і Пружанскі р.

***

Як і цапу, так і лапу, выбілі капу без сараку, без петаку, без пятнаццаці снапоў. Колькі яны змалацілі?

(Нічога).

***

Сем семярэй, семера свіней, свінка. Свінчын брат і семера парасят?

(Усяго 65). Слонімскі павет.

***

Падзяліць сорак коней у дзевяць стайняў. Каб не было пароўну.

(У чатырох стайнях па 5 коней, а ў пяці – па 4). Хойніцкі р.

***

За сто рублёў купіць сто штук быдла: валы па дзесяць рублёў, каровы па пяць, падцёлкі па паўрубля.

(Вол – 1, кароў – 9, падцёлкаў – 90). Слонімскі павет.

### *Жарты*
### Кумкі

- Кума, колькі ж гэта гадоў Марылі Гамзовай?
- А гэта лёгка вылічыць: тры гады ёй было па 28, два – па 29, сем гадоў ёй было па 30, а цяпер чацвёрты год, як мае – 31, дык разам – 48.

(Жарты…№ 605).

***

### Святая арыфметыка

Спавядаецца ў царкве злодзей: украў сто снапоў жыта.

- А як ты ўкраў? – пытецца поп. – Адразу ці паасобку?
- Ды не, за чатыры разы па дваццаць снапоў.
- Дык гэта ж будзе восемдзесят снапоў, а не сто.
- Гэта так, але ж я хачу сёння ўзяць яшчэ дваццаць снапоў.

(Жарты… № 710. Зап. В. Фаменка).

### *Забаўлянкі*

Гоп-гоп, і-га-га.
На буланцы едзець Янка,
Паўтараста рублей санкі,
Пяцьдзесят рублей дуга,
А кабылка паўрубля.
Гоп-гоп, і-га-га.

(Дзіцячы фальклор. Зап. у 1971 г. у в. Закор'е Браслаўскага раёна Віцебскай вобл. ад Валі Паўловіч, 12 год).

Заданне.
Падлічыце якой маёмасцю валодае Янка? (Дзвесце рублёў з паловаю).

### *Дражнілкі*

Сівы-сівы, па колькі слівы?
Як па пяць, то буду браць.
Як па дваццаць пяць,
То няхай яны зграць.

(Мінская вобласць. Зап. Ермаковіч Ж. у в. Гацк Салігорскага раёна ад Новік С.).

## Песні
### Ой, там на таргу, на базары…

Ой, там на таргу, на базары
Жонкі мужыкоў таргавалі.
Як прыйдзецца да ладу,
Дак я свайго павяду да й прадам *.
Із лык матузоў навязала
Да й на мілага павязала.
Як прывяла на базар,
Да тэрніцы прывязала.




Як наехалі пакупніцы,
Як наехалі таргаўніцы,
Сталі думаць і гадаць,
Што за майго мужа даць?

А за майго мужа трэба даць,
А за майго мужа трэба даць:
Пару коней вараных,
Шчэ й сто рублей залатых.

З коньмі трэба вадзіцца,
А з грашамі трэба насіцца,
А мой мілы, чарнабрывы,
На работу не лянівы,
Ён самой мне прыгадзіццца.

Ён пасее й паарэ
Ні для кога, для мяне.
Мой міленькі, даражэнькі,
Пашкадую я цябе! — Не прадам!

(Гомельская вобласць. Зап. Яраслаўцава Р., Абраменка Е. У 1984 г. у в. Праскурні Жлобінскага раёна ад Аніскаўцавай М., 1912 г.н., Аўсяннікавай А., 1928 г.н. і інш.).

### *Замовы*

### Прысушка

Цераз 77 палёў, цераз 77 бароў, 77 лясоў пасылаю Міколу 77 катоў, 77 чарцей. Вы, чарты, бяжыце і Міколу на ложку стукніце ў левую шчаку і ў сэрца, каб жыўшы – не забыў, каб хадзіўшы – не праходзіў, каб спаўшы – не праспаў, каб думаўшы – не прадумаў, каб еўшы – не праеў. Як жыве рыба без вады, а мёртвы без зямлі, каб і Мікола так жыў без Ганны.

(Гомельская вобласць. Зап. у 1978 г. у в. Роўкавічы Чачэрскага раёна ад Шаўчэнкі А., 1912 г.н.).

### *Казкі*

Можна выкарыстаць наступныя творы: «Самы разумны» – Беларускія народныя казкі. С. 443-444; «Як баба гусі прадавала» – тамасама. С. 460-461; «Іван-Дабрамысел» – Казкі ў сучасных запісах. С. 239-245; «Мужык-багацей» -- тамасама. С. 368-370; «Чалавечы век» – тамсама. С. 392-393.

### *Святы*

**Саракі** (Сорака, Сарака, Саракасвятыя, Сорак пакутнікаў) – свята народнага календара, якое праводзілася ў каталікаў 9, а ў праваслаўных 22 сакавіка. У народзе казалі, нібы на Саракі прылятае 40 «выраяў», а таксама, што гэта свята «пчальніковае» і ўжо канчаткова прыходзіць вясна. Гаварылі: «На Саракі дрэвы адпушчаюцца», «На Саракі мужык пытаецца, ці далёка да ракі»; «Святыя Саракі ў поле саху валаклі». Выпякалі з цеста для дзяцей 40 жаваранкаў, у некаторых мясцовасцях — 40 варэнікаў, 40 маленькіх піражкоў, галушак. Кожнаму неабходна з'есці 40 клёцак. На Случчыне пяклі «патапцы», якія называлі «жаваранкамі». Іх падсалоджвалі, абсыпалі макам для дзіцячага пачастунку. Выпякалі таксама пірагі ў выгля-дзе сельскагаспадарчых прылад: бараны, сярпа, касы, сахі і інш. Згодна з павер'ямі, сарока пачынае віць сабе гняздо і прыносіць для гэтага 40 пруцікаў. Але чакалі яшчэ сорак маразоў. Нібыта з выраю тады прылятае сорак жаваранкаў. Хлопчыкі павінны да ўсходу сонца, не памыўшыся і закрыўшы вочы, падабраць на двары сорак трэсак і высыпаць іх пад печ або перакінуць цераз хату столькі ж палачак. Хто выканае гэта, той вясною знойдзе 40 птушыных гнёздаў (або сорак качыных яек).

Засталося нямала назіранняў і сведчанняў, якія гавораць аб свяце птушак: «На Саракі прыляцелі з-за мора птакі», «Ластаўкі вылятаюць з возера» (якія восенню туды апусціліся), «На Саракі... вылятае з цёплага краю вястун вясны жаваранак; пасля яго гракі, што бывае за 12 дзён да адкрыцця вады».

Вобразы птушак багата прадстаўлены ў народным мастацтве. Добра характарызуюць свята валачобныя песні: «Святыя Саракі напярод пайшлі» (Віцебская губ.), «Ды Саракі дровы рубюць, клады кладуць» (Каплаўская вол. Ілукстэнскага пав.), «А і Саракі ды, вой, плятуць смыкі» (Лепельскі р-н), «Святы Саракі – да не йдзі да ракі» (Полацкі р-н), «Святы Саракі – сорак вырай вылятаюць» (Лепельскі р-н), «Саракі ільды дралі, птушак напушчалі» (Веліжскі пав. Віцебскай губ.), «Святы Саракі – лемяшы істрацъ» (Лепельскі пав, Віцебская губ.), «Святыя Саракі ў поле саху валаклі» (Барысаўскі р-н).

Народ ведаў, што «на Сорак мучанікаў дзень з ноччу мераецца». Відаць, у старажытнасці ён звязваўся з вясеннім раўнадзенствам, ад якога пачыналася вясна (дзень астранамічнага вясенняга раўнадзенства 20—21 сакавіка). У Свіслацкім раёне на Саракі саджаюць расаду.

У Ельнінскім павеце дзеці праводзілі цікавую гульню: выконвалі пахаванне «трункі» з насякомымі, спявалі: «Жылі не сяляне, памерлі не радзіцелі». Малыя і дарослыя гушкаліся на арэлях, «каб лён рос», скакалі на дошках. «У гэты дзень ёсць звычай дваім гушкацца на дошцы, стоячы на ўвесь рост. На Саракі бесперапынна трэба скакаць на дошцы, штоб пагрэцца за тых бедненькіх мучанікаў, што, не маючы як сагрэцца, памерзлі насмерць» .

У гэтым свяце бачыцца перапляценне старадаўніх язычніцкіх рэлігійных уяўленняў з хрысціянскімі і дамінаванне ў сінкрэтычным развіцці першых; праяўленне фетышызму («жаваранкі» з цеста), анімізму (пакланенне птушкам: качцы, жаваранку), магіі (перакідванне палак цераз хату і інш).

Добра развітая традыцыя свята бытуе ў народаў Югаславіі. Дзень 40 пакутнікаў па царкоўным і народным календарах адзначалі сербы, чарнагорцы, македонцы, нават мусульмане паўднёваславянскага паходжання ў Македоніі. Як і ў нас, лічба 40 з'яўлялася цудадзейнай (40 маленькіх абаранкаў, 40 зёрнаў, 40 келіхаў гарэлкі і г.д.).

***

**Сёмуха** (Сямік, Тройца, Клечанне) – язычніцкае свята, у якім праглядвае культ продкаў і расліннасці, прымеркаванае пазней царк вою да хрысціянскай Пяцідзесятніцы (50-ы дзень пасля Пасхі; Сёмуха – сёмы тыдзень пасля Пасхі).

Папярэдні дзень называлі Зялёнай (Кляновай) суботай (Зелянец, Май, Зялёныя святкі) – свята маладой зеляніны. Варажылі пра надвор'е. Асвячалі травы, абкурвалі хаты, жывёлу, каб не баялася перуноў. У Магілёўскай губерні сеялі каноплі, дзяўчаты хадзілі ў лес «завіваць вянкі». Гаварылі: «На Зелянец вясны канец».Увага да зеляніны, а яна з'яўляецца дамінуючай, — несуменна язычніцкая традыцыя. Асвячэнне кветак і зёлак, упрыгожванне «маем» будынкаў і памяшкання, пляценне і нашэнне вянкоў, дзявочая варажба і іншыя абрадавыя рытуалы, «завіванне бярозак» падчас «кумлення» і абрадавай ежы, прысутнасць расліннай тэматыкі ў абрадавых песнях («Выхвалялася бярозка») – гэта сведчанні анімістычных уяўленняў нашых продкаў, што ідуць яшчэ з дахрысціянскай пары. Вядомы прымаўкі: «Да Святога духа не скідай кажуха», «На Духа будзець цёпла і суха». У гэты дзень садзілі капусту, каноплі.

Упрыгожвалі «маем» будынкі. У Лельчыцкім раёне рвалі рагоз («лепеху») і клалі на падлогу, каб не было блох. Дзяўчаты хадзілі ў лес «завіваць» бярозкі, плясці вянкі, есці абрадавую страву (яйкі). На Міёршчыне спявалі: «Хадзіла Тройца каля аконца. Я ж, маладзенькая, не выспалася...»

У некаторых раёнах Палесся называлі гэтае свята Клечаннем, відаць, таму, што галінкамі клёна ўпрагожвалі хаты.

Дзень святой Тройцы, Пяцідзесятніца – вялікае царкоўнае свята, якое ўваходзіць у лік асноўных («двунадзесятых»), адно з дванаццаці, прысвечана памяці даравання Богам Маісею дзесяці запаветаў, спасланню святога духа на апосталаў, якія панеслі сведчанне пра ўваскрэслага Ісуса. Гэты момант лічыцца нараджэннем царквы, што прызнае трыадзінства, Святую Тройцу: Бог-Айцец, Бог-сын і Дух Святы.

Не складае цяжкасці заўважыць, што сёмушныя традыцыі маюць дахрысціянскае паходжанне, бо не выяўляюць у падабенстве па зместу з хрысціянскай Тройцай, хаця і ўзнікла яна як свята даволі рана — у 381 годзе, калі на царкоўным саборы ў Канстанцінопалі была прынята ў якасці асноўнага элемента сімвала веры. Найбольшае распаўсюджанне атрымала на нашых землях ужо праз стагоддзе, калі была ўключана Сяргеем Раданежскім у «рухомы» праваслаўны каляндар і ўдала злілася з сёмушнымі абрадамі і звычаямі.

Няма сумнення ў тым, што царкоўная Тройца замяніла нейкае вялікае язычніцкае свята. Югаслаўскія вучоныя уносяць меркаванне, што гэта магло быць свята Русалляў . Румынская народная традыцыя сведчыць у карысць выказанай думкі. Там Тройца аб'ядноўвае дзве плыні, якія і адлюстраваны ў назвах свята: Duminika mare (Вялікая нядзеля) і Rusalii, хаця Русаліі адзначаюцца, як і ў нас, на наступны дзень. Маецца падобнасць у традыцыях і назвах святкаванняў народаў Еўропы: Духове, Тројице, Тројичин дан, Русал е, Русал и, Пресвета – сербы, чарнагорцы; Дуовден, Светатроица – македонцы; Duhovi, Trojaki, Rusalije, Rusalju — харваты; Binkosti, Trjaki, Risali, Risalski svetki – славенцы; Русална, Русалијска або Русана недел а – сербы, чарнагорцы.

Албанскія традыцыі Русіцаў звязаны з кветкамі і культам продкаў. Таксама праводзілася рытуальная трапеза і даўняя цырымонія «пахавання маці сонца» ў выглядзе глінянай фігуркі чалавека.

## Літаратура

I


Балады. У дзвюх кн./ Склад. Л. М. Салавей. Мн., 1977. Кн.1.

Беларускі народны каляндар /Аўт.-скл. А. Лозка. Мн., 1993.

Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць. /Уклад. В. А. Захарава, Р. М. Кавалёва, В. Д. Ліцьвінка. Мн., 1989.

Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць /Уклад. В. Ліцьвінка. Мн., 1995.

Беларускія народныя казкі /Склад. Г. А. Барташэвіч, К. П. Кабашнікаў. – Мн., 1986.

Вяселле. Песні / Склад. Л. А. Малаш. Мн., 1981. Кн. 2.

Дзіцячы фальклор / Склад. Г.А. Барташэвіч. Мн., 1972.

Жарты, анекдоты, гумарэскі / Склад. А.С.Фядосік. Мн., 1984.

Загадкі /Склад.М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі. Мн., 1972.

Замовы / Уклад. Г. А. Барташэвіч. Мн., 1992.

Казкі ў сучасных запісах / Уклад. К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч. Мн., 1989.

Лозка А. Беларускі народны каляндар. Мн., 2002.

Прыказкі і прымаўкі. У дзвюх кн. /Склад. М. Я. Грынблат. Мн., 1976.

Санько З. Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем. Мн., 1991.

Чурко Ю. М. Вянок беларускіх танцаў. Мн., 1994.


II


Арлова Г.П. Беларуская народная педагогіка. Мн., 1993.

Арлова Г.П. Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы. Мн., 1995.

Беларусазнаўства. I – XI кл. Зб. 1 – 4 /Кір. творч. калект. А.Лозка. Мн., 1992 – 1994.

Беларусазнаўства: Навучальны дапам. БДУ /Навук. рэд. П.Брыгадзін. Мн., 1997; 1998.

Беларуская народная педагогіка ў сістэме дашкольнага выхавання. Мн., 1994.

Беларускі фальклор у школе. 1 – 3 класы /І.І.Сучкоў і інш. Мн., 1996; 2000; 2001.

Грымаць А.А., Варанецкая Л.М. Беларуская народная педагогіка ў школе. Мн., 1996.

Калачова І.І. Народныя традыцыі і звычаі выхавання. Мн., 1999.

Народная педагогіка беларусаў /Пад рэд. В.К. Бандарчыка, М.Ф. Піліпенкі і інш. Мн., 1996.

Народная спадчына – дашкольнікам /Пад рэд. А.Лозкі. Мн., 1998.

Ракава Л.В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы. Мн., 2000.

Салееў В.А. Этнапедагогіка і эстэтычнае развіццё асобы. Мн., 1994.


III


Жытко І. У., Бараноўская В. П., Хадановіч Л. С. Гуляем, навучаем, развіваем, ці Знаёмім дзяцей з матэматыкай. Мн., 1997.

Пралеска. Выхаванне і навучанне дзяцей у дашкольнай установе. Базісная праграма і метадычныя рэкамендацыі. Мн., 2000.



**Матэматычны фальклор**: Пачатковыя матэматычныя ўяўленні і навыкі сродкамі народнай педагогікі / Аўтар-склад. А. Лозка. - Мн., 2002. – 52 с.

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Таварыства беларускай школы». Тэл. (017) 2740472.
Красавік 2002 г.  Наклад  асобнікаў.